

САКРЭТЫ ТЫТУЛАВАНАЙ ЛЁГКААТЛЕТКІ **11**

НА РОВАРЫ ПА ВАЛОЖЫНШЧЫНЕ **12**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЖНІЎНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 159 (28775)


## ЛІЧБА ДНЯ

**Больш за 150**

*узораў прадукцыі ваеннага прызначэння прывезлі на чацвёртую міжнародную ваенна-тэхнічную выстаўку «Армія-2018», якая пройдзе 21—26 жніўня ў падмаскоўнай Кубінцы, прадстаўнікі беларускага ваенна-прамысловага комплексу. Прадпрыемствы айчыннай абаронкі прэзентуюць досыць шырокі спектр новай і перспектыўнай прадукцыі, створанай з прымяненнем інавацыйных тэхналогій. Як адзначылі ў Дзяржкамваенпраме, форум «Армія-2018» стане не толькі адной з ключавых пляцовак для дэманстрацыі беларускай прадукцыі ваеннага прызначэння, але і месцам для прыцягнення новых партнёраў і ўстанаўлення з імі доўгатэрміновых узаемаадносін у сферы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Чакаецца, што ў мерапрыемстве прымуць удзел больш за 1,2 тысячы найбуйнейшых расійскіх канцэрнаў, вядучыя канструктарскія бюро і навукова-даследчыя інстытуты, кампаніі з 15 краін.*

## КОРАТКА

• **У Магілёве з 20 жніўня па 19 верасня праходзіць месячнік па наведзенні парадку.**

• Агульны аб'ём інвестыцый у стварэнне мэблевай вытворчасці ў Івацэвічах складзе 20 млн еўра.

• **15 жніўня на ўчастку аўтамагістралі М6 Мінск — Гродна, які рэканструяваўся, адкрыўся рух.**



• Рассельгаснагляд з 20 па 24 жніўня правядзе інспекцыю шэрагу беларускіх прадпрыемстваў — вытворцаў яблыкаў і таматаў.

• **Прафсаюзы Брэсцкай вобласці праводзяць збор сродкаў у аднаўленне радавой сядзібы Напалеона Орды ў Іванаўскім раёне.**


ISSN 1990 - 763X


# РАБІЦЬ СВАЮ РАБОТУ. НАЙЛЕПШЫМ ЧЫНАМ

**Гэты тыдзень для краіны пачаўся як заўсёды: людзі выйшлі на свае рабочыя месцы і робяць сваю звычайную справу. Напэўна, гэта галоўны паказчык стабільнасці: змена кіраўніцтва ўрада не выклікала збояў ні ў эканоміцы, ні ў фінансавай сферы, няма ніякай занепакоенасці сярод абывацеляў. У інтэрнэце, тэле- і радыёэфіры з'явілася навіна, інфармацыя пра новых кіраўнікоў, развагі пра іх жыццёвы вопыт, спадзяванні на плённасць перамен, нарэшце, самыя розныя каментарыі чытачоў.**

Безумоўна, былі і абмеркаванні прычын адставак. Яны з'явіліся яшчэ на мінулым тыдні, і ў суботу кіраўнік дзяржавы яшчэ раз паказаў на іх прычыны, якія былі як на паверхні, так і ў глыбіні працэсаў кіравання пэўных галін нашай эканомікі і сацыяльнай сферы.

З таго, што адбылося, трэба зрабіць высновы, якія датычацца не толькі дзяржслужачых самага высокага рангу, але і кожнага жыхара Беларусі: мінулі часы, калі можна было выехаць на паказусе. Гэтаксама як даўно ўжо не трэба спадзявацца, што нехта нешта зробіць за нас або для нас, а мы, маўляў, пачакаем. І яшчэ — важна навучыцца працаваць камандай, разам, бо дасягненне мэты залежыць ад сумы намаганняў кожнага, і вельмі важна з кожным лічыцца. Працэс супрацы павінен прыносіць задавальненне, а сама мэта — паляпшэнне таго, што ёсць. Хопіць ужо заспакойвацца тым, што дзень сённяшні прайшоў не горш за ўчарашні. Нам трэба прызвычаіцца імкнуцца да лепшага, і не ў марах, а сваімі справамі, ладам жыцця, стаўленнем да таго, што робім. І не павольна, а імкліва, бо час у нас такі — не церпіць адкладанняў і спазненняў. Гісторыя паказала, што мы не баімся складаней работы. Мы ўмеем перамагаць. І сапраўды здольныя зрабіць нашу краіну прывабнай у сусветных маштабах.


СТАР. 2-3


# СВЯТАЯ СПРАВА — ЗБОЖЖА ЖАЦЬ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Спецыялісты навучальнай гаспадаркі Відзаўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа Браслаўскага раёна дапамагаюць жыхарам вёскі Богіна — убіраюць збожжавыя на прысядзібных палетках.**

■ Уласная гаспадарка

# БЕЛАРУСКАЯ МАРА ЛУНЯ

## Гісторыя пра тое, як кітаец працуе фермерам на Валожыншчыне

**«Шлях у тысячу лі пачынаецца з першага кроку», — кажа кітайская прыказка. Ці не гэты выраз натхніў Вэнь Сюэчжэня пераадолець восем тысяч кіламетраў паміж Пекінам і Мінскам, каб здзейсніць сваю мару?**

Знаёмцеся, гэта Лунь. Так Вэнь Сюэчжэня называюць сябры і родныя. Яму 31 год. Ён жыве ў вёсцы Пральнікі, што на Валожыншчыне. І на гэтай зямлі за чатыры гады зрабіў ужо мноства крокаў, каб яго жаданні ажыццявіліся.

— Пакаштуй, які салодкі, малінавы, — працягвае гаспадар памідор.

З падзякай адкусваю кавалак сакавітай мякаці. Я не асаблівы эксперт у памідорах, але смак «свойскай» агародніны ад магазіннай адрозніваецца значна.

Лунь знаёміць нас са сваёй гаспадаркай. Заходзім у цяпліцу. Яна здаецца бясконцай, ва ўсю даўжыню — радкі высокіх памідораў, якія апусцілі свае гронкі пад цяжкімі пладамі.

— А вось гэта — чэры. Яны вельмі добра захоўваюцца. А гэты сорт памідораў мае зялёны колер. Не здзіўляйцеся, пакаштуйце, які сакавітыя.


СТАР. 8





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# КАДРЫ, ЯКІЯ ВЫРАШАЮЦЬ

## Прэзідэнт зрабіў шэраг назначэнняў у беларускім урадзе

**Мінулая субота, нягледзячы на дажджлівае надвор'е ў сталіцы, стала сапраўды «спякотнай» з-за палітычных падзей. Кадравыя змены ва ўрадзе, новыя міністры і адказ кіраўніка дзяржавы на крытыку ў інтэрнэце і СМІ, тое, што было на слыху ўсе выхадныя. Карэспандэнт «Звязды» была непасрэдна на месцы падзей у палацы Незалежнасці.**

### Новая каманда ўрада

Пасаду **прэм'ер-міністра Беларусі заняў Сяргей РУМАС.** Да гэтага ён узначальваў Банк развіцця, які займаўся ўдасканаленнем сістэмы фінансавання дзяржаўных праграм і рэалізацыяй сацыяльных інвестпраектаў. **Першым намеснікам Сяргея Румаса назначаны Аляксандр ТУРЧЫН,** які да гэтага кіраваў Апаратам Саўміна. Курыраваць паліўна-энергетычны комплекс на пасадзе **намесніка прэм'ер-міністра будзе Ігар ЛЯШЭНКА,** былы старшыня канцэрна «Белнафтахім». За будаўніцтва, ЖКГ, транспарт будзе адказваць **намеснік прэм'ера Уладзімір КУХАРАЎ.** «Гэта аснова. А далей вам вызначаць ва ўрадзе, як вы размяркуеце гэтыя абавязкі», — падкрэсліў беларускі лідар. Раней Уладзімір Кухараў працаваў намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю. Сацыяльная сфера: адукацыя, медыцына, культура, спорт — зона адказнасці яшчэ аднаго **віцэ-прэм'ера Ігара ПЕТРЫШЭНКІ,** які працаваў паслом Беларусі ў Расіі.

Да справы падбору кандыдатаў на найважнейшыя дзяржаўныя пасады былі падключаны старшыні грамадскіх арганізацый, кансультацыю з якімі прэм'ерадні правяла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава. Цяперашняе кіраўніцтва ўрада стане самым маладым у гісторыі краіны.

Новае пакаленне кіраўнікоў прыйшло і ў некалькі міністэрстваў. **Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ўзначаліць Дзмітрый МІКУЛЁНАК,** які працаваў дырэктарам камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама». Новым **міністрам прамысловасці стаў Павел УЦЮПІН.** «Ведаеце сферу. Вы там, памойму, гадоў пяць прапрацавалі. І вельмі добра, што вы папрацавалі і ў Міністэрстве эканомікі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, назначаючы Паўла Уцюпіна на пасаду.

**Міністэрствам эканомікі будзе кіраваць** былы першы намеснік міністра **Дзмітрый КРУТОЙ.** Прэзідэнт звярнуў увагу, што міністэрству трэба набыць «новае дыханне» і прыстасавацца да «новых рэалій».

Беларускі лідар наступным чынам прадставіў **новага міністра сувязі і інфарматызацыі Канстанціна ШУЛЬГАНА:** «Чалавек дысцыплінаваны, ваенны, які вельмі добра ведае гэтую сферу і асабліва перспектыву развіцця, звязаную з інфармацыйнымі тэхналогіямі, стварэннем вялікай удзельнай вагі ў эканоміцы IT-сферы».

Змяніўся і **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. Ім стаў Раман ГАЛОЎЧАНКА.** Акрамя вопыту ў гэтай галіне, ён працаваў і ў дыпламатычнай сферы.

### «Справа не толькі ў Оршы»

Шматлікія правалы даручэнняў на Віцебшчыне не сталі адзінай прычынай перамен ва ўрадзе. «Я хачу сказаць: справа не толькі ў Оршы. Гэта апошняя кропля, якая перапоўніла чашу цярпення. Галоўнае — у глыбіні», — заявіў Прэзідэнт.

Галоўная прэтэнзія кіраўніка дзяржавы да працы мінулага ўрада — валакіта і безадказнасць, непаслядоўнасць дзеянняў, па словах Аляксандра Лукашэнкі, выявілася ў многіх рашэннях. Адным са спрэчных пытанняў стала прыватызацыя, якая не павінна негатыўна ўплываць на эканоміку і не ўстойлівае развіццё. Бо апошняе з'яўляецца гарантам незалежнасці.

«Ніхто не супраць прыватызацыі. Было выразна мною вызначана. Па кожным прадпрыемстве, малым або вялікім, па працоўных калектывах — там людзі жывуць і працуюць — мы павінны вызначацца, перш чым прадаваць акцыі гэтага прадпрыемства», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Уважаць трэба ўсе плюсы і рызыкі, што прынясуць новыя інвестары: рабочыя месцы і заробкі, ці, наадварот, — звальненні. Пра апошняе Прэзідэнт сказаў адназначна: «Такая прыватызацыя нам не патрэбна».

Даручэнне кіраўніка дзяржавы дасягнуць сярэдняга заробку па краіне ў 1000 рублёў было ўспрынята ўрадам як недапушчальнае. Такая ж рэакцыя была і на даручэнне павысіць заробкі нізкааплатным работнікам: «нянечкам у садках, бальніцах», — прывёў прыклад Прэзідэнт.

«Добра, я прапанаваў альтэрнатыву. Давайце тады разам з вамі будзем мець тую зарплату, якую маюць гэтыя няшчасныя нянечкі. Ды не, ва ўрадзе гэта немагчыма, трэба менеджарам ва ўрадзе падымаць заработную плату, і чым вышэй, тым лепш яны будуць працаваць. Дык што ж гэта за спраўядлівасць?» — абурыўся кіраўнік дзяржавы.

Няўдала праведзеныя і перагаворы з Міжнародным валютным фондам. Умовы падняць аплату камунальных паслуг да 100 % і прыватызаваць дзяржмаёмасць былі непрымальнымі для грамадства. Беларускі лідар прапанаваў іншае рашэнне: павялічваць працэнт аплаты камунальных паслуг адпаведна павышэнню заробкаў (на пяць долараў кожны год).

«Прэзідэнт ставіць адну задачу, а тут ізноў спрабуюць праціснуць ва ўрадзе, ды і Нацыянальным банку, не кім, дык палкай гэтую так званую ліберальную пазіцыю», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля свайго назначэння ў размове з журналістамі Сяргей Румас паабяцаў, што дысцыпліне будзе ўдзяляцца першасная ўвага: «Кіраўнік дзяржавы пачаў з гэтага — пытанні дысцыпліны, прыстойнасці і пытанні дабрабыту людзей. Што датычыцца апошняга, кіраўнік дзяржавы падрабязна спыніўся на гэтым. І рост дабрабыту людзей будзе з'яўляцца асноўнай ацэнкай работы аднаўленага складу ўрада».

### Ад «разносу» да «пацёмкінскіх вёсак»

Пасля кадравых пытанняў Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў водгукі ў інтэрнэце на апошнія ўнутрыпалітычныя падзеі краіны.

Рашэнні Прэзідэнта падчас і пасля аршанскай камандзіроўкі якія толькі эпітэты не атрымалі ад каментатараў у Сеціве: і «разнос урада», і «паказальная лупцоўка», і «кадравыя чысткі». «Але ўказ падпісвае на прызначэнні членаў урада Прэзідэнт. І што, вы хочаце сказаць, што я назначыў гэтых членаў урада для таго, каб разнос зладзіць? Гэта значыць, самому сабе. Таму Прэзідэнту ну ніяк не выгадна мець такі ўрад, якому трэба ўстройваць разнос», — растлумачыў беларускі лідар.

Неперспектыўны, на думку Прэзідэнта, і еўрапейскі вопыт конкурснага адбору на кіруючыя пасады. Ва ўладзе павінны быць людзі, якія маюць вопыт, жаданне працаваць і любяць свой народ. Такім з'яўляецца новае пакаленне кіраўнікоў. «І дай бог, каб мы не памыліліся і вы былі адданымі і надзейнымі людзьмі, каб не здарылася, як у нас у сістэме аховы здароўя: карупцыянер на карупцыянеры сядзіць і карупцыянерам паганяе», — выказаў свае спадзяванні Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да назначэння чыноўнікаў.

Асаблівы акцэнт і на беларуска-расійскіх адносінах, якія заўсёды былі не проста на высокім, а на брацкім узроўні. Сведчанне таму і даўняе знаёмства двух лідараў, і маштабная база саюзных дагавораў, інтэграцыйных праектаў.

«Расія баіцца страціць Беларусь, некаторыя кажуць, што рэспубліка развярнулася на Захад. Ды нікуды мы не развярнуліся і разварочвацца не збіраемся. Наш лёс вызначаны Госпадам — быць тут, у цэнтры Еўропы. Вось гэтым трывалым моцным мостам паміж Усходам і Захадам», — канстатаваў Прэзідэнт.

Даў наказ кіраўнік дзяржавы і новым кадрам, папярэдзіўшы аб недапушчальнасці карупцыі.

Пракаментаваў Прэзідэнт і «марафет» у гарадах перад яго прыездам. Навядзенне лоску не павінна праводзіцца ў стылі пацёмкінскіх вёсак. «Калі хтосьці да прыезду Прэзідэнта зробіць добрую справу, я буду толькі ўдзячны. Але гэта павінна быць планава, людзі павінны бачыць карысць ад гэтага, гэта не павінна быць паказушна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Ніякіх пацёмкінскіх вёсак у Беларусі няма і ніколі не будзе».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Дысцыпліна, згуртаванасць, дабрабыт людзей

## Новы прэм'ер-міністр расказаў аб планах работы ўрада

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава афіцыйна прадставіла супрацоўнікам Апарату Савета міністраў новы склад урада краіны: новага прэм'ер-міністра Сяргея Румаса, першага намесніка прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына і трох намеснікаў прэм'ер-міністра — Ігара Ляшэнку, Уладзіміра Кухарава і Ігара Петрышэнку. З папярэдняга складу на пасадзе намесніка прэм'ер-міністра застаўся Міхаіл Русы. Чакаецца, што размеркаванне абавязкаў паміж віцэ-прэм'ерамі адбудзецца на гэтым тыдні.**

«Думаю, што прэм'ер-міністр яшчэ ўважліва вывучыць структуру ўрада і функцыянальныя абавязкі кожнага. Магчыма, будуць нейкія змены, пра гэта кіраўнік урада паведаміць», — сказала Наталля Качанава.

Яна адзначыла, што Адміністрацыя Прэзідэнта праце ва ўзаемадзеянні з урадам па многіх пытаннях, уключаючы і эканамічны блок. Наталля Качанава выказала надзею, што ў далейшым такая работа будзе сумеснай і эфектыўнай.

Акрамя таго, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта акцэнтавала ўвагу на тым, што ўраду будзе неабходна эфектыўна працаваць над задачай, якую паставіў Прэзідэнт па развіцці ўсіх рэгіёнаў краіны. Паводле яе слоў, ужо зроблена шмат для аграгарадкоў, абласных цэнтраў, а цяпер неабходна заняцца сярэднімі гарадамі, дзе пражывае больш за 50 тысяч жыхароў.

«Высокаэфектыўныя прадпрыемствы павінны быць у кожным горадзе і раёне, каб людзі разумелі, што ў іх ёсць работа. Усім, хто працуе ва ўрадзе, трэба яшчэ раз уважліва пагледзець і зрабіць акцэнты на ключавых момантах, пра якія гаварыў Прэзідэнт, і прыняць усе меры, каб пастаўленыя задачы былі рэалізаваны», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Сяргей Румас у выступленні перад Апаратам урада падзякаваў Прэзідэнту за аказаны давер. «Я разглядаю гэта прызначэнне як вялікую адказнасць і выклік для мяне асабіста. Сёння пачынаецца, напэўна, самы адказны этап у маім жыцці, які патрабуе канцэнтрацыі ўсіх сіл і навыкаў, вопыту, які я атрымаў на папярэдніх пасадах. Персанал Апарату ўрада вядомы сваім прафесіяналізмам. Гэта вялікі гонар для мяне кіраваць вамі», — заявіў Сяргей Румас.

Каментуючы планы па курсе, які абярэ новы склад Савета Міністраў, ён адзначыў, што ўся праца будзе грунтавацца на задачах, якія ўжо вызначаны праграмнымі дакументамі.

«Не варта чакаць нейкай рэвізіі прынятых рашэнняў. Кіраўнік дзяржавы пры прызначэнні новага складу ўрада зрабіў акцэнты на такія рэчы, як дысцыпліна і згуртаванасць. Акрамя таго, шмат увагі было ўдзелена дабрабыту насельніцтва. Прэзідэнт падкрэсліў, што менавіта ўзровень дабрабыту людзей будзе асноўнай ацэнкай работы ўрада. Над гэтай задачай нам давядзецца працаваць з поўнай самааддачай», — рэзюмаваў Сяргей Румас.

Учора Сяргей Румас і яго намеснікі прадставілі новых кіраўнікоў міністэрстваў іх калектывам.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Ураджай

# ЗАСТАЛОСЯ ЎБРАЦЬ МЕНШ ЗА 7 %

**Ураджай у краіне амаль сабраны. Пра гэта сведчыць аператыўная інфармацыя Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Усяго з палёў убралі больш за пяць мільёнаў тон збожжавых і зернебабовых культур. Сярэдняя ураджайнасць склала 26,5 цэнтнера з гектара.**




Практычна завершана ўборачная кампанія ў Брэсцкай вобласці, дзе збожжа засталося на 1,7 % плошчаў. Агульны намалот там склаў 922,8 тысячы тон.

Завяршаецца ўборка і на Міншчыне. Там аграрыі сабралі самы вялікі ўраджай па краіне — 1289,4 тысячы тон. У Гомельскай і Гродзенскай абласцях з палёў вывезлі 566,2 тысячы тон і 859,6 тысячы тон адпаведна. Набліжаюцца да завяршэння работы і ў паўночным рэгіёне. Намалот у Віцебскай вобласці — 684,6 тысячы тон (там убралі збожжа з 85,4 % пасяўных плошчаў), у Магілёўскай — 720,6 тысячы тон (збожжа ўбрана з 90,1 % пасяўных плошчаў).

Сельгасарганізацыі 14 раёнаў Гомельскай вобласці пачалі ўборку кукурузы на сілас. Сёлета пасевы кукурузы ў рэгіёне былі пашыраны больш чым на шэсць тысяч гектараў і склалі 306 тысяч гектараў. На зялёную масу адведзена звыш 240 тысяч гектараў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

## РУМАС

### Сяргей Мікалаевіч, прэм'ер-міністр,



нарадзіўся ў 1969 годзе ў Гомелі. У 1990 годзе скончыў Яраслаўскае вышэйшае ваеннае фінансавае ордэна Чырвонай Зоркі вучылішча і да 1992 года праходзіў службу ва Узброеных Сілах. У 1995 годзе ён скончыў Акадэмію кіравання пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У 1992—1994 гадах быў начальнікам уліко-ва-аперацыйнага аддзела, крэдытнага аддзялення, эканамічнага аддзела спецыялізаванага ўпраўлення Нацыянальнага банка Беларусі.

З мая па жнівень 1994 года — намеснік старшыні праўлення КБ «Поўнач-Захад» Мінска. Затым да 1995 года з'яўляўся намеснікам старшыні праўлення АКБ «Садружнасць» Мінска.

У 1995-2002 гадах — дырэктар філіялаў № 507 і № 514 ААТ «ААБ Беларусбанк».

З 2002 па 2005 год займаў пасады намесніка старшыні, а затым першага намесніка старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк».

Пасля перайшоў працаваць старшынёй праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» і займаў гэту пасаду да 2010 года.

У 2010-2012 гадах — намеснік прэм'ер-міністра Беларусі. Затым быў назначаны старшынёй праўлення Банка развіцця Беларусі.

## ТУРЧЫН

### Аляксандр Генрыхавіч,

**першы намеснік прэм'ер-міністра,**



нарадзіўся ў 1975 годзе ў Навагрудку. У 2002 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, у 2009 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1997—1998 гадах быў дырэктарам магазіна калгаса «Авангард» Навагрудскага раёна.

Са студзеня па ліпень 1999 года — дзяржаўны падатковы інспектар інспекцыі дзяржаўнага падатковага камітэта па Навагрудскім раёне.

У 1999—2004 гадах займаў пасаду галоўнага кантралёра-рэвізора кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў па Навагрудскім раёне, затым па Гродзенскай вобласці. У далейшым да 2007 года ўзначальваў фінансавы аддзел Карэліцкага райвыканкама Гродзенскай вобласці.

З 2007 па 2010 год быў намеснікам старшыні Карэліцкага райвыканкама.

У 2010-2012 гадах — старшыня камітэта эканомікі Мінскага аблвыканкама. Затым да 2015 года займаў пасаду намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама.

З 2015 па 2016 год — памочнік Прэзідэнта Беларусі — галоўны інспектар па Гомельскай вобласці. З 2016 года кіраваў Апаратам Савета Міністраў Беларусі.

## ЛЯШЭНКА

### Ігар Васільевіч, наменік прэм'ер-міністра,



нарадзіўся ў 1974 годзе ў горадзе Ачамчыра Абхазскай АССР. У 1996 годзе скончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт.

У снежні 1996 года працаваў падатковым інспектарам Дзяржаўнай падатковай інспекцыі па Савецкім раёне Гомеля.

У 1997—1998 гадах — інжынер другой катэгорыі аддзела маркетынгу Гомельскага хімічнага завода. З 1998 па 2006 год быў начальнікам планава-эканамічнага аддзела на гэтым прадпрыемстве. У 2006—2013 гадах — дырэктар Гомельскага хімічнага завода.

Затым быў назначаны першым намеснікам старшыні канцэрна «Белнафтахім». Узначальваў яго з 2014 года.

## КУХАРАЎ

### Уладзімір Яўгенавіч,

**намеснік прэм'ер-міністра,**



нарадзіўся ў 1972 годзе ў вёсцы Ціманава Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1993 годзе скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, у 1999 годзе — Беларускі недзяржаўны інстытут правазнаўства, у 2012 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1993—1999 гадах быў дырэктарам Барысавіцкай няпоўнай сярэдняй школы Клімавіцкага раёна, потым сярэдняй школы № 3 Клімавічаў.

З 1999 па 2009 год займаў розныя пасады ў структурах Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Затым па 2012 год з'яўляўся кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска.

У 2012—2016 гадах — першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама.

У 2016 годзе зноў вярнуўся ў Камітэт дзяржаўнага кантролю, але ўжо на пасаду намесніка старшыні ведамства.

## ПЕТРЫШЭНКА

### Ігар Віктаравіч, наменік прэм'ер-міністра,



нарадзіўся ў 1965 годзе ў вёсцы Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1986 годзе скончыў Вільнюскае каманднае вучылішча радыёэлектронікі, у 1992 годзе — Ваенны Чырванасцяжны інстытут, у 1998 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1986—1996 гадах праходзіў службу ва Узброеных Сілах.

З 1996 па 1999 год — саветнік, галоўны саветнік, начальнік дагаворна-прававога ўпраўлення апарату міністра па справах СНД Апарату Кабінета Міністраў Беларусі, затым Апарату Савета Міністраў Беларусі.

У 1999—2003 гадах займаў пасады начальніка ўпраўлення міждзяржаўнага супрацоўніцтва Апарату Савета Міністраў, намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення міждзяржаўнага супрацоўніцтва і гандлю — начальніка ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Апарату Савета Міністраў.

З лютага па жнівень 2003 года быў намеснікам начальніка ўпраўлення Расіі і Саюзнай дзяржавы Міністэрства замежных спраў.

У 2003—2007 гадах — саветнік пасольства Беларусі ў Расіі.

У 2007—2008 гадах быў начальнікам упраўлення Расіі і Саюзнай дзяржавы МЗС, пасля чаго назначаны першым намеснікам міністра замежных спраў Беларусі і займаў гэту пасаду да 2012 года.

Затым з'яўляўся Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Расіі, Пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Эканамічным савеце СНД, Паўнамоцным прадстаўніком пры АДКБ па сумяшчальніцтве і спецыяльным прадстаўніком Беларусі па пытаннях інтэграцыйнага супрацоўніцтва.

## МІКУЛЁНАК

### Дзмітрый Міхайлавіч,

**міністр архітэктуры і будаўніцтва,**



нарадзіўся ў 1973 годзе. Скончыў Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію ў 1996 годзе і Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі ў 2006 годзе.

У 1996—2004 гадах — інжынер, майстар па будаўніцтве, прараб, вядзенні работ, начальнік вытворчага аддзела будаўнічага ўпраўлення № 256 Мінскага арэнднага прадпрыемства індустрыяльнага домабудавання «Мінскжылбуд» (у 2001 годзе пераўтворана ў ААТ «МАПІД»).

З 2004 па 2006 год быў галоўным спецыялістам КУП «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама», затым намеснікам дырэктара па ўзвядзенні будынка Нацыянальнай бібліятэкі КУП «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама».

У 2006—2011 гадах — галоўны інжынер — першы намеснік дырэктара КУП «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама». З 2011 года быў дырэктарам прадпрыемства.

## УЦЮПІН

### Павел Уладзіміравіч,

**міністр прамысловасці,**



нарадзіўся ў 1976 годзе ў сяле Папоўка Харольскага раёна Прыморскага краю Расіі. У 1998 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, у 2007 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1994—1995 гадах быў намеснікам дырэктара па знешнеэканамічных сувязях малога прадпрыемства «Дубль В» (Барысаў).

З 1995 па 1999 год — начальнік аддзела знешнеэканамічных сувязяў вытворча-камерцыйнай фірмы «УТВ» (Барысаў).

З лютага па лістапад 1999 года — эканаміст планава-эканамічнага аддзела сумеснага беларуска-германска-расійскага прадпрыемства «Фрэбор».

У 1999—2002 гадах — аспірант Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Пасля да 2006 года займаў пасады саветніка і галоўнага саветніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

З 2006 па 2011 год — намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах ААТ «Белшына».

У 2011 годзе назначаны намеснікам міністра прамысловасці, у 2017-м — намеснікам міністра эканомікі.

## ШУЛЬГАН

### Канстанцін Канстанцінавіч,

**міністр сувязі і інфарматызацыі,**



нарадзіўся ў горадзе Бяроза Брэсцкай вобласці. У 1989 годзе скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча проціпаветранай абароны.

З чэрвеня 1989 года па студзень 1995 года праходзіў службу на пасадах інжынера трэцяга аддзела вайсковай часці 51458 і старшага афіцэра чацвёртага аддзела Дзяржаўнага цэнтра бяспекі інфармацыі пры Міністэрстве абароны Беларусі.

Затым па чэрвень 2008 года займаў пасады старшага афіцэра, галоўнага спецыяліста, начальніка групы, начальніка аддзела ў структуры Дзяржаўнага цэнтра бяспекі інфармацыі пры Савеце бяспекі Беларусі.

У 2008—2013 гадах праходзіў ваенную службу на афіцэрскіх пасадах у Аператыўна-аналітычным цэнтры пры Прэзідэнце Беларусі. У красавіку 2016 года назначаны намеснікам начальніка ААЦ.

## КРУТОЙ

### Дзмітрый Мікалаевіч,

**міністр эканомікі,**



нарадзіўся ў 1981 годзе ў пасёлку Бялынічы Магілёўскай вобласці. У 2003 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, у 2010 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

Са жніўня 2003 года па 2004 год — інжынер кафедры эканомікі і кіравання на прадпрыемствах хіміка-лясного комплексу Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, аспірант ВНУ.

У 2004—2006 гадах — вядучы, галоўны эканаміст сектара арганізацыі аплаты працы і цэнаўтварэння ўпраўлення эканомікі і інвестыцый Міністэрства лясной гаспадаркі.

У 2006—2014 гадах — намеснік начальніка ўпраўлення лясного комплексу галоўнага ўпраўлення аграпрамысловага і лясного комплексаў Міністэрства эканомікі, затым намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аграпрамысловага і лясного комплексаў — начальнік упраўлення лясного комплексу.

У 2014 годзе назначаны намеснікам міністра эканомікі, у 2017 годзе — першым намеснікам міністра.

## ГАЛОЎЧАНКА

### Раман Аляксандравіч,

**старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта,**



нарадзіўся ў 1973 ў Жодзіне. У 1996 годзе скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін МЗС Расіі, у 2003 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1996—1997 гадах з'яўляўся рэферэнтам старшыні праўлення, намеснікам генеральнага дырэктара ЗАТ «Белтэхэкспарт».

З 1997 па 2002 год — галоўны спецыяліст Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі Беларусі.

У 2002—2005 гадах — намеснік начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем законаў у ваенна-прамысловым комплексе пракуратуры Беларусі.

Затым да 2006 года быў галоўным саветнікам упраўлення знешняй палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

У 2006—2009 гадах — галоўны саветнік аддзела супрацоўніцтва ў сферы міжнароднай бяспекі, галоўны саветнік упраўлення міжнароднай бяспекі Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі.

З ліпеня па снежань 2009 года — саветнік-пасланнік пасольства Беларусі ў Польшчы.

Затым назначаны першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі, займаў гэтую пасаду да 2013 года.

У красавіку 2013 года стаў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, пазней па сумяшчальніцтве — у Катары, Кувейце і Саудаўскай Аравіі.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя

№ 6 (34)

■ Тэма нумара

# КАЛІ ДАКЛАДНАСЦЬ — ЗАЛОГ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ

## Навядзенне парадку на зямлі патрабуе навуковых падыходаў і выключае фармалізм

**Удзельнікі выязной калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на прыкладзе Лагойскага раёна абмеркавалі работу, што праводзіцца ў краіне па навядзенні парадку на зямлі.**



### Другасныя рэсурсы — задача № 1

Шмат пытанняў у розных рэгіёнах краіны сёння выклікае работа ў галіне абыходжання з адходамі. Паводле інфармацыі Мінпрыроды, за першае паўгоддзе 2018 года выяўлена 3788 фактаў размяшчэння адходаў у несанкцыянаваных месцах, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 987 вінаватых асоб, сума штрафаў склала 219 тысяч рублёў. Акрамя таго, спецыялісты зафіксавалі 1028 фактаў захавання другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) на палігонах і 1976 парушэнняў правілаў эксплуатацыі аб'ектаў захавання цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА).

На Лагойшчыне таксама ёсць праблемы ў гэтай сферы. Як расказаў дырэктар РУП «Лагойскі камгас» Яўген Халімоненка, штогод у раёне ўтвараецца каля 12 тысяч тон адходаў. Іх захоўваюць на двух палігонах (у райцэнтры і ў Плешчаніцах), там жа знаходзіцца і нарыхтоўчыя пункты па зборы ДМР. Пры гэтым Лагойшчына моцна адстае ад большасці рэгіёнаў краіны па здабычы ДМР — толькі 6,3 % адходаў трапляюць на перапрацоўку.

Дарэчы, нізкія ўзроўні (6-10 %) выкарыстання ЦКА ёсць і ў іншых рэгіёнах — такая сітуацыя назіраецца ў 22 раёнах краіны, большасць з якіх знаходзіцца ў Мінскай вобласці.

— Гэта сведчыць пра фактычную адсутнасць работы камунальных гаспадарак у згаданым кірунку, — упэўнены **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** *(на фота)*. — Неабходна вывучыць паспяховы вопыт другіх рэгіёнаў і пачаць прымяняць яго. Напрыклад, запушчаная ў канцы мінулага года ў Слонімскім раёне лінія па сартаванні ЦКА ўжо сёння дазваляе выкарыстоўваць 34 % адходаў.

Міністр таксама звярнуў увагу інспектараў па ахове навакольнага асяроддзя на неабходнасць павышэння эфектыўнасці кантрольнай дзейнасці.

Каб у рабоце па абыходжанні з адходамі выкарыстоўваць найлепшыя і самыя эфектыўныя тэхналогіі і метады, Мінпрыроды плануе сумесна з Мінжылкамгасам распрацаваць тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі «Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі».

### Падлічыць агрэсара

Другое важнае пытанне, якое абмеркавалі падчас калегіі, — барацьба з баршчэўнікам Сасноўскага. Праблема засілля гэтай расліны актуальная не толькі для Беларусі, але і Расіі, Украіны і некаторых краін Еўрасаюза. Цалкам вынішчыць агрэсара, на думку міністра, немагчыма, але можна істотна знізіць плошчы, якія ён займае.

— Барацьба з распаўсюджваннем баршчэўніка Сасноўскага — справа не аднаго года, — упэўнены Андрэй Худык. — Насенне гэтай інвазіўнай расліны доўгі час захоўваецца ў глебе. З яго дапамогай, а таксама дзякуючы развітому кораню, на наступны год баршчэўнік зноў можа ўзысці. Каб сур'ёзна знізіць яго колькасць, патрэбна работа як мінімум трох-пяці гадоў.

У краіне налічваецца 1148 карыстальнікаў зямельных участкаў і водных аб'ектаў, у якіх выяўлена 4534 месцы росту баршчэўніку Сасноўскага. Агульная плошча «захопу» — 2924,1 га. Найбольш інвазіраванай застаецца Віцебская вобласць — на яе прыходзіцца 72,7 % ад агульнай плошчы, якую займае расліна. На другім месцы — Міншчына (12,5 %), пры гэтым каля 30 % усіх зараснікаў баршчэўніку вобласці знаходзіцца ў Лагойскім раёне.

Сёння з агрэсарам змагаюцца ўсімі даступнымі сродкамі (хімічнымі, механічнымі, камбінаванымі) і з удзелам зацікаўленых арганізацый — прадпрыемстваў меліярацыйных сістэм і сельскай гаспадаркі.

Як расказаў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ**, за першае паўгоддзе 2018 года выкананы ўсе запланаваныя мерапрыемствы па рэгуляванні колькасці баршчэўніку Сасноўскага. Выключэнне складае Віцебская вобласць, там выканана толькі 85 % ад задання.

Пры гэтым, па словах Андрэя Худыка, падчас інвентарызацыі частка выяўляецца, што рэальная плошча, якую сёння займае баршчэўнік, не адпавядае даным, пазначаным у мясцовых планах. Так, у Аршанскім раёне яна павялічылася ў шэсць разоў, у Чашніцкім — у сем і г. д.

Міністр упэўнены — каб убачыць рэальную карціну, у краіне неабходна правесці палявыя абследаванні для выяўлення новых месцаў росту баршчэўніку. Вынікі гэтай інвентарызацыі будуць адлюстраваны ў рэспубліканскім плане мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі на 2019 год. Акрамя таго, у наступным годзе Мінпрыроды плануе распрацаваць тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі, які вызначаць патрабаванні да правядзення работ па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці інвазіўных раслін.



Фота Вольгі ПРАЛЮК.

**Лагойшчына — адзін з самых праблемных рэгіёнаў Мінскай вобласці па распаўсюджванні баршчэўніку Сасноўскага.**

**Вераніка КОЛАСАВА**

■ Зваротная сувязь

# Людзі кажуць «дзякуй» Мінпрыроды

**На адрас ведамства паступаюць падзячныя лісты ад жыхароў нашай краіны**

Спецыфіка работы Мінпрыроды такая, што часцей яно асацыюецца са штрафамі, прадпісаннямі. Тым больш прыемна, калі людзі бачаць і іншы бок работы падраздзяленняў Міністэрства, а менавіта — дапамогу насельніцтву ў вырашэнні надзённых праблем. З боку можа здацца, што пытанні дробныя, не міністэрскага ўзроўню, але ўсё глабальнае пачынаецца менавіта з дробязяў.

Паліна Зыль і Уладзімір Раткевіч з вёскі Вязынка Маладзечанскага раёна доўга «ваявалі» з мясцовым садовым таварыствам. Дачнікі выкідвалі смецце і адходы за межы сваёй тэрыторыі і забруджвалі навакольную лясную паласу, і да жылых дамоў звалка падбіралася.

Па-добраму вяскоўцам і дачнікам дамовіцца не ўдалося. Тады неабыякавыя жыхары адправілі электронны зварот на адрас Маладзечанскай райінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Было гэта ў пятніцу, а ўжо ў панядзелак начальнік Маладзечанскай РІ ПРіАНА Уладзіслаў Чарноў прыбыў у садовае таварыства і правёў адпаведную работу з парушальнікамі. Жыхары вёскі Вязынка ў лісце на імя першага намесніка міністра Іі Малкінай звяртаюць увагу найперш на аператыўнае рэагаванне і дзякуюць Уладзіславу Чарнову «за прафесіяналізм, адказнасць і кампетэнтнасць кіраўніка, чулыя адносіны да праблем людзей».

Дом жыхара пасёлка Прывольны Мінскага раёна Сулеймана Рака суседнічае з занядбаным пладовым садам, які зарос барщчэўнікам Сасноўскага. Зрэшты, гаспадар саду вядомы — Мінская агароднінная фабрыка. Як і многія іншыя арганізацыі, яна ўключылася ў барацьбу з барщчэўнікам Сасноўскага і ў чэрвені зрабіла апрацоўку хімічнымі сродкамі агрэсіўнага пустазелля. Аднак альбо прэпарат апынуўся неэфектыўны, альбо доза была недастатковая, але барщчэўнік працягваў расці. А фабрыка больш ніякіх мер не прадпрымала.

Тады Сулейман Міхайлавіч запісаўся на асабісты прыём у Мінпрыроды, які вёў у той дзень Мікалай Свідзінскі, начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці. Выслухаўшы заяўніка, Мікалай Іванавіч паабяцаў, што пытанне будзе вырашана на працягу 2-3 дзён. І на самай справе, праз тры дні барщчэўнік скасілі. Спецыялісты ведаюць, што найбольш эфектыўны спосаб барацьбы з гэтым пустазеллем — камбінаваны, то-бок хімапрацоўка з наступнай касьбой.

Сулейман Рак напісаў ліст на імя міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Худыка, у якім выказаў падзяку спецыялістам ведамства «за спагадлівасць і якасна выкананую работу».

**Маргарыта ВЯРБІЦКАЯ**

■ Грамадская ініцыятыва

# Любоў да прыроды вымяраецца клопатам

## Неабыякавыя людзі могуць не толькі адстойваць правы, але і наводзіць парадак на сваёй зямлі

«Звязда» раней пісала пра канфліктную сітуацыю, якая склалася паміж ААТ «Амкадор» і жыхарамі Мінскага раёна. Пляцоўкай для размяшчэння новага завода «Амкадор» абраў Калодзішчы, да таго ж дзеля будоўлі аднаго з аб'ектаў давялося б высекчы лес. Мясцовыя жыхары былі катэгарычна супраць. У якасці экспертаў яны прыцягнулі навукоўцаў, і тыя высветлілі — у лесе растуць «чырванакніжнікі».

Пры такім раскладзе, натуральна, гаворка пра будаўніцтва ў лесе ўжо не ідзе. Натхнёныя яго выратаваннем, мясцовыя жыхары арганізавалі суботнік на гэтай тэрыторыі. Ва ўборцы лесу прынялі ўдзел 60 мясцовых жыхароў і дэпутат райсавета.

А наогул суботнік часам нагадваў урок біялогіі, які праводзіў **кандыдат біялагічных навук Алег МАСЛОЎСКІ, кіраўнік сектара кадастру расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі.** Вучоны знаёміў мясцовых жыхароў з раслінамі, занесенымі ў Чырвоную кнігу Беларусі, таму суботнік атрымаўся яшчэ і пазнавальным. «Мы будзем надалей дапамагаць вам, паколькі ў вас ёсць ініцыятыва, — цытуе «Зялёны партал» Алега Маслоўскага. — Сёння гаварылася пра рух грамадскіх інспектараў. Усе гэтыя расліны патрабуюць кантролю. Хацелася б, каб неабыякавыя людзі, школьнікі, маглі маніторыць колькасць чырванакніжнікаў, стан, ступень пагрозы, уносіць у дакументы аператыўныя змяненні. І калі нешта здарыцца, каб вінаваты панёс пакаранне».

А пакуль у лесе наведзены парадак, і мясцовыя жыхары поўныя рашучасці падтрымліваць яго і надалей.

Апошнім часам у неабыякавых грамадзян становіцца добрым тонам не чакаць, калі хто-небудзь навядзе парадак, а дзейнічаць самім. Нярэдка руціныя ўборкі тэрыторый ператвараюцца ў крэатыўныя мерапрыемствы. Так, напрыклад, у Бараўлянах стартаваў праект «Экаквэсты». У ім могуць удзельнічаць і дзеці, і дарослыя. Сутнасць праекта ў тым, што нехта, магчыма, саромеецца прыбіраць смецце, а калі гэта арганізавана ў форме гульні, спаборніцтва, то знікаюць псіхалагічныя комплексы.

«Мінпрыроды высока ацэньвае падобныя грамадскія ініцыятывы і заўсёды гатова падтрымаць мясцовых жыхароў у іх жаданні зрабіць сваю зямлю яшчэ больш прыгожай і чыстай, добраўпарадкаванай. Па падтрымку ў рэалізацыі сваіх экалагічных ідэй грамадзяне могуць звяртацца ў тэрытарыяльныя органы міністэрства, — сказала **Алена МЕЛЯШКОВА, прэс-сакратар Мінпрыроды.** — Пры неабходнасці можа быць арганізавана навуковае суправаджэнне, аказана метадычная, арганізацыйная і іншая дапамога».

**Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ**

■ Экалагічны складнік

## Анатоль ЦЭЙКА:

# «Усе зацікаўлены ў бяспецы станцыі»

### Інфацэнтр БелАЭС не мае сакрэтаў ад мясцовага насельніцтва і замежнікаў

**Мы працягваем знаёміць чытачоў з вопытам работы начальнікаў раённых інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, імёны якіх занесены на Дошку гонару Мінпрыроды. Анатоль ЦЭЙКА восць ужо дзевяць гадоў узначальвае інспекцыю ў Астраўцы.**

***— Анатоль Казіміравіч, дзякуючы ўзвядзенню Беларускай АЭС, райцэнтр у Гродзенскай вобласці ведаюць ва ўсім свеце. А якія змены ў вашай рабоце адбыліся ў сувязі з грандыёзнай будоўляй?***

— Калі толькі было абвешчана, што пляцоўкай для будаўніцтва АЭС выбраны Астравец, да нас прыходзіла шмат звычайных гараджан. Іх хваляваў стан экалогіі і бяспекі. Цяпер такіх зваротаў практычна няма. У гэтым адыграў важную ролю інфармацыйны цэнтр БелАЭС, дзе ўсё даступна тлумачыцца для людзей з розным узроўнем ведаў, бо чым больш у чалавека інфармацыі, тым менш страхаў. Інфацэнтр БелАЭС пачаў сваю работу яшчэ ў 2009 годзе. Тады яго часова размясцілі ў гарадскім кінатэатры. Цяпер ён знаходзіцца ў сучасным будынку. Але самае галоўнае, вядома ж, даступнасць і нагляднасць інфармацыі. Тут яна сістэматызавана, і наведвальнікі дзівяцца, напрыклад, з таго, як шмат у «старой» Еўропе атамных станцый ці як блізка да буйных гарадоў размешчаны некаторыя заходнія станцыі. У Швейцарыі адна з АЭС пабудавана ўсяго за 12 км ад Берна, у Бельгіі — за 16 км ад Антверпена, у Славеніі — за 8 км ад харвацкага Заграба. У інфацэнтры праводзяць экскурсіі для турыстычных груп, індывідуальных падарожнікаў. Прыкладна 30 % наведвальнікаў — замежнікі.

***— Ці створана на БелАЭС экалагічная служба?***

— Яна была з самага пачатку, хоць і мяняліся некалькі разоў назвы структуры. З аддзелам аховы навакольнага асяроддзя беларускай дырэкцыі БелАЭС у нас устаноўлены добрыя працоўныя кантакты. Таксама спецыяліст-эколаг працуе і ў штаце расійскай дырэкцыі. У мяне ёсць пастаянна дзеючы пропуск на пляцоўку і, натуральна, гэты аб'ект наведваю рэгулярна. Усе зацікаўлены ў бяспецы станцыі для людзей і прыроды.

***— На тэрыторыі раёна шэсць буйных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Што можна сказаць пра іх стаўленне да наваколля?***

— Калі параўнаць стаўленне вяскоўцаў да экалогіі гадоў 20 таму і цяпер, то бачныя пазітыўныя перамены, ва ўсякім разе, усе кіраўнікі разумеюць,



што мы ў адказе за сваю зямлю. Мы можам запісаць сабе ў актыў, што кожнае наша сельгаспрадпрыемства мае неабходныя дакументы на права водакарыстання. Было няпроста сабраць і падрыхтаваць іх, але вынік ёсць. Таксама адказна ставяцца да барацьбы з баршчэўнікам Сасноўскага. На тэрыторыі нашага раёна выяўлены 34 месцы вырастання гэтага небяспечнага інвазіўнага пустазелля. Усе нашы землекарыстальнікі сістэмна змагаюцца з гэтай навалай.

***— У сельскай мясцовасці існуе праблема старых гаспадарчых пабудоў, пакінутых дамоў. Як яна вырашаецца ў раёне?***

— Праблема сапраўды ёсць, асабліва, што датычыцца безгаспадарных дамоў. Са свайго досведу магу сказаць, што калі дом, пакінуты бацькамі ў спадчыну, пустуе год, то ўжо ніхто ім займацца не будзе. Гараджане часцей за ўсё бацькоўскія хаты рамантуюць, добраўпарадкоўваюць участак, адным словам, прыстасоўваюць пад лецішча. А калі спадчыннік жыве ў суседняй вёсцы, у яго свой добры дом, то бацькоўская хата пустуе. Сама складаная катэгорыя — гэта спадкаемцы, якія жывуць за мяжой. Тым не менш сістэма адпрацавана: сельвыканкам шукае спадчыннікаў, яны прымаюць рашэнне па маёмасці. Калі спадчыннікаў устанавіць не ўдаецца або яны не выходзяць на сувязь з выканкамам, рашэнне прымае суд. Гэтыя працэдуры патрабуюць часу. Сёлета знеслі 17 безгаспадарных дамоў. Працэдура афармлення дакументаў для зносу старых будынкаў, якія знаходзяцца на балансе юрыдычных асоб, значна прасцейшая, таму фермаў-развалін у нашым раёне вы не ўбачыце.

***— Як складваецца супрацоўніцтва інспекцыі і грамадскасці?***

— Вельмі добра. Адзіны ў краіне міжнародны экалагічны інфармацыйны цэнтр «Захаваем атлантычнага ласося» створаны ў нашым раёне на базе вучэбна-педагагічнага комплексу «Варнянскі яслі-сад — сярэдняя школа» пры падтрымцы грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Кааліцыі «Чыстая Балтыка».

Наш грамадскі інспектар Віктар Урбановіч вельмі актыўна дзейнічае, выязджае з намі ў рэйды, супрацоўнічае са школьным лясніцтвам «Лесавічок». Дарэчы, нашы юныя ляснічыя ў 2016 годзе сталі пераможцамі ў сусветнай алімпіядзе «TNO», якая праходзіла ў Фінляндыі. А яшчэ нашы школьнікі пасадзілі 180 тысяч дрэў!

Віктар Урбановіч прымаў удзел у Міжнароднай выстаўцы-кірмашы ў Вільнюсе, на якой дэманстраваў экспанаты экалагічнага турызму Астравецкага раёна. Па гэтай тэме нам ёсць што паказаць і чым ганарыцца. На тэрыторыі раёна размешчаны дзясяткі помнікаў прыроды мясцовага значэння, а таксама рэспубліканскія заказнікі: водна-балотны «Белы мох» і ландшафтны «Сарачанскія азёры», які па праве называюць «дыяментавымі каралямі Беларусі». Спецыялісты заказніка распрацавалі цікавыя водныя і веласіпедныя маршруты для адпачывальнікаў. У нашага раёна ёсць усё для таго, каб стаць турыстычным цэнтрам. Тут фантастычна прыгожыя месцы. І гэта не толькі прырода, але і помнікі архітэктуры. Усім гэтым багаццем хочацца падзяліцца з іншымі людзьмі. Вядома, мы рады свядомым, экалагічна дружалюбным падарожнікам, і тых, на шчасце, усё больш.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**



■ У свеце жывёл



# «Птушка не разумее, чаму мы ўмешваемся ў яе жыццё»

### Як паводзіць сябе з падлеткамі і параненымі звярамі

**Бяздумнае спажыванне альбо празмернае спачуванне — на жаль, у дачыненні да дзікай прыроды чалавек часта ўпадае ў крайнасці. Так, хтосьці ловіць пяцідзесяцікілаграмовага сома на смажанага вераб'я і з гонарам заяўляе пра гэта на ўсю краіну, а хтосьці бяздумна падбірае раненых жывёл, а потым не ведае, што з імі рабіць. Як бы мы ні хацелі, чалавек усё ж не вянец прыроды, таму, у большасці сваёй, найлепшае, што мы можам зрабіць, — не ўмешвацца ў яе законы.**

Цалкам натуральна, што, калі чалавек бачыць птушку з падбітым крылом ці падлетка, які крычыць, у яго ўзнікае жаданне дапамагчы. Толькі вось на адным жалі далёка не заедзеш, заўсёды трэба аналізаваць свае дзеянні. Бо дамінаванне эмацыянальнага над рацыянальным можа прывесці да непрыемных вынікаў.

— Праблема ў тым, што спробы выратаваць дзікую жывёлу могуць нашкодзіць не толькі гэтай жывёле, але і чалавеку. Таму для сваёй жа бяспекі неабходна прапрацаваць алгарытм дзеянняў, перш чым нешта рабіць, — расказала **кансультант аддзела біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна ЖАЛЯЗНОВА.** — Нам вядомы сумны выпадак, калі жаласлівыя людзі спрабавалі выратаваць параненую лісу, а па дарозе ў клініку яна ўкусіла дзіця. Ліса аказалася шалёнай. Ці, напрыклад, студэнт знайшоў чырванакніжную птушку з падбітым крылом, патэлефанаваў нам, мы яму параілі дачакацца спецыялістаў, але ён усё роўна вырашыў дапамагчы самастойна: пасадзіў птушку ў заплечнік і павёз у ветклініку. Вядома, да назначанага месца яна жывой не даехала.

Спецыяліст падкрэсліла: каб нікому не нашкодзіць, дастаткова прытрымлівацца простага правіла: знайшлі пакалечаную жывёлу — тэлефануйце ў спецыялізаваную службу (МНС, МУС ці тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды), але самі яе не чапайце! Паколькі ў некаторых выпадках тым жа птушкам дапамога чалавека абсалютна не патрэбна, а вось лішні кантакт з людзьмі для дзікіх жывёл — заўсёды стрэс.

На месцы збіраецца спецыяльная камісія, куды ўваходзяць ветэрынары, прадстаўнікі ведамства, мясцовага выканаўчага органа і арнітолагі. Сумесна камісія прымае рашэнне аб далейшым лёсе жывёлы. Калі яна паранена, то аказваецца неабходная дапамога, калі ж траўмы несумяшчальныя з жыццём, то яе прыходзіцца ўсыпіць, каб не траўмаваць яшчэ больш.

— Адзначу, што мы прымаем меры толькі ў экстранных выпадках. Калі жывёла можа справіцца сама, то не чапаем яе. У прыродзе ёсць свае заканамернасці. Так, падчас неспрыяльных умоў надвор'я буслы выкідваюць адно птушаня з гнязда, паколькі разумеюць, што пракарміць яго не ў сілах. Мы некалькі разоў яго вярталі, але ўсё паўтаралася па крузе. Птушка не разумее, чаму мы ўмешваемся ў яе жыццё. І, праўда, у гэтай справе чалавеку не месца, — адзначыла Таццяна Жалязнова.

Як бы сумна гэта ні гучала, але ў моцна параненай жывёлы практычна няма шанцаў выжыць у дзікай прыродзе, нават калі ёй акажа дапамогу чалавек. Праблема ў тым, што ў Беларусі вельмі мала ўрачоў, якія спецыялізуюцца на дзікіх жывёлах. У асноўным, скалечаныя канечнасці яны ампутуюць, што пазбаўляе жывёлу магчымасці абараняцца ад драпежнікаў і самастойна здабываць сабе ежу. Таму часта птушку без крылаў або з адной лапкай можна сустрэць у жывых кутках устаноў адукацыі або ў знаёмага ў якасці хатняга гадаванца.

— Нас часта крытыкуюць, што мы даём шмат адсылак да натуральнага адбору, але праўда такая, што выратаваць кожную жывёлу нерэальна. Калі вы, дапусцім, узялі параненую птушку, вылечылі яе, то яна, магчыма, і будзе радавацца жыццю і радаваць вас, але для дзікай прыроды такая жывёла памірае, — падкрэсліў **спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Максім НЯМЧЫНАЎ.**

## Марына Даманцэвіч расказвае пра закулiссе самага знясiльваючага вiду спорту

**Цяперашнi чэмпiянат Еўропы па лёгкай атлетыцы стаў самым паспяховым для беларускай каманды. А адны з самых яркiх эмоцый нам падарылi менавiта марафонкi, мужная перамога Вольгi Мазуронак i заваяванне нашымi дзяўчатамi каманднага кубка выклiкалi цiкавасць не толькi суайчыннiкаў, але i сусветнай спартыўнай грамадскасцi. Дапамагла дамагчыся такога поспеху яшчэ адна дзяўчына — Марына Даманцэвiч, з найлепшым для сябе часам яна фiнiшавала чацвёртай. А летась Марына стала першай беларускай, якой удалося выйграць паўднёваафрыканскi ультрамарафон (56 кiламетраў) «Два акiяны». Сёння спартсменка дзелiцца сваiмi ўражаннямi ад чэмпiянату Еўропы, напярэдаднi Мiнскага паўмарафону дае парады аматарам бегу i расказвае пра асаблiвасцi гэтага вiду спорту.**

***— Марына, крыху не хапiла да прызавой тройкi на чэмпiянаце Еўропы, цi задаволены сваiм вынiкам?***

— Для мяне турнiр склаўся вельмi добра, я рыхтавалася да яго некалькi месяцаў, спецыяльна нiкуды не ездзiла, нiдзе не выступала. Трэнiравалася штодзень, нягледзячы на тое, што ў мяне ёсць яшчэ iншая работа — трэнер у трэнажорнай зале. Даводзiцца прачынацца ў 5.30 — 6 ранiцы, iсцi рабiць спачатку сваю трэнiроўку, а потым трэнiраваць вучняў. Да таго ж у мяне ёсць яшчэ i клуб аматараў бегу ў Наваполацку. З-за такой занятасцi настолькi ўдалы вынiк у Берлiне для мяне стаў нечаканасцю. Сказаць, што памiрала на дыстанцыi — не магу, беглася выдатна. Не атрымалася ўвайсцi ў тройку, з дзяўчатамi, якiя мяне апярэдзiлi, я ўжо бегла два месяцы таму паўмарафон у Празе, ведала, што яны моцныя, таму старалася трымаць сваю пазiцыю, прадчувала, што яны ўсё роўна збягуць ад мяне. Вынiк атрымаўся вельмi добры, аб такiм часе заўсёды марыла, хацела выбегчы з дзвюх гадзiн трыццацi хвiлiн, але ў мяне нiколi не атрымлiвалася. На нейкi момант нават перастала ў гэта верыць, але ўсё роўна iшла i трэнiравалася. I вось, атрымалася. Чацвёртае месца ў Еўропе — гэта цудоўны вынiк для мяне.

***— Траса ў Берлiне была складаная?***

— Не, бегавая, простая для марафону, дзе сапраўды можна паказваць добры вынiк. Самая складаная траса для нас, калi ёсць горкi, бегчы ў такiм выпадку цяжка, уздымы марнуюць час, пакуль разбяжышся, а там зноў гара. На чэмпiянаце Еўропы было шмат паваротаў, псiхалагiчна гэта таксама цяжка, трошкi цiсне, што паварот iдзе за паваротам. Дзяўчаты кажуць, што падчас бегу ў Берлiне быў вецер, а я яго нават не заўважыла, бо проста бегла i атрымлiвала кайф. Яшчэ i ў лiдарах, думаю, што я ствараю? Але вырашыла: калi ўжо пачала, то буду змагацца да канца, выйсця проста не было. Ведала, што за мяне хварэюць, чакаюць i падтрымлiваюць. Да таго ж хацелася даказаць людзям, якiя ў мяне не верылi, а такiя былi, што я яшчэ нешта магу, нават нягледзячы на тое, што ў мяне няма трэнера, усё раблю сама, без якой-небудзь падтрымкi. Дзякуй Вадзiму Анатолевiчу (Дзевятоўскi, старшыня Беларускай федэрацыi лёгкай атлетыкi. — **Заўв. аўтара**), дапамагаў мне два месяцы, падтрымлiваў, даваў зборы.

***— Вы ўжо пачалi казаць пра вецер, наогул, умовы надвор'я важныя для марафонцаў?***

— Вельмi важныя. Супраць ветру бегчы цяжка, гледзячы яшчэ, якая прамая, калi яе працягласць два кiламетры, то бегчы ў два разы складаней. Але за ўсю сваю кар'еру заўважыла, што калi iдзе дождж i дзьме вецер, то забег складваецца для мяне паспяхова, пастаянна нават нейкiя асабiстыя рэкорды атрымлiваюцца.

***— На чэмпiянаце ўсiх уразiла здарэнне з Вольгай Мазуронак, якой па ходзе забегу прыйшлося спраўляцца з крывацёкам з носа. Цi часта спартсмены сутыкаюцца з праблемамi, якiя датычацца здароўя?***

— Так, такiя сiтуацыi бываюць, напярэдаднi ты можаш быць гатовы выдатна,



а вось менавiта ў гэты дзень наогул немагчыма бегчы. Асаблiва жаночы арганiзм можа выдаваць рознае. Уздоўж трасы заўсёды ёсць людзi, якiя могуць аказаць медыцынскую дапамогу, калi сыдзеш з дыстанцыi, цябе нават давязуць да фiнiшу. Але прафесiйныя спартсмены вельмi рэдка карыстаюцца дапамогай, калi нават падаем, праз боль будзем бегчы, але сваю справу зробiм. Парой прыбягаеш на фiнiш i толькi тады ўспамiнаеш, што ў цябе нешта там здарылася. Аматары, вядома, ставяцца да гэтага па-iншаму. А для нас вельмi важны час, нават ваду п'еш, як мага хутчэй, толькi каб не выдаткаваць шмат часу.

***— У вас асабiста былi форс-мажоры?***

— Сышла з дыстанцыi толькi адзiн раз, бегла марафон у Стамбуле, нага практычна аднiмалася, па ёй пайшлi нейкiя колiкi, я проста не магла працягваць. Было яшчэ, што ўшчамiўся нерв, я дабегла дыстанцыю на прамойназе. Iшла першая, таму не магла спынiцца, думала ў той момант толькi пра тое, што буду бегчы, пакуль не ўпаду. Прыехала дадому i трапiла ў бальнiцу, але, на шчасце, усё добра абышлося.

***— Гэты вiд спорту аказвае моцны ўплыў на здароўе?***

— Ну, паглядзiце, аматараў на спаборнiцтвах збiраецца шмат, па 3—5 тысяч, яны робяць гэта для свайго задавальнення, як кардыянагрузка — карысна. Мы, прафесiяналы, часта бяжым на мяжы сваiх магчымасцяў, таму сiтуацыя iншая. Праблемы спартсмены пачынаюць адчуваць дзесьцi да 37 гадоў, моцна б'е па нагах, ад асфальту забiваюцца мышцы ног i сцёгнаў.

***— Як ставяцца родныя да таго, што вы бегаеце марафоны?***

— Яны ганарацца мною, мама, вядома, кажа: «Марына, можа, хопiць? Падумай пра здароўе». Але я сама разумею, буду бегаць пакуль адчуваю сябе добра, калi адчую, што больш не магу, — скончу са спортам. Дачка заўсёды хварэе за мяне, засмучаецца, калi я не прывожу медальку, але заўсёды кажа: «Мама, галоўнае не перамога, а ўдзел».

***— На ультрамарафоне «Два акiяны» на старце вас збiлi з ног, часта такое бывае?***

— Не, гэта проста выпадковасць, у асноўным у нас выхаваныя i культурныя людзi, якiя дапамагаюць, падымаюць, калi штосьцi здараецца.

***— Як вы звычайна аднаўляецеся пасля марафону?***

— Магу днi два, тры наогул нiчога не рабiць, а магу на наступны дзень прабегчы кiламетраў шэсць для сябе.

***— Ваш трэнiровачны працэс уключае працяглыя прабежкi, роўныя па кiламетражы марафону?***

— Вядома! Як правiла, выбiраеш для сябе суботу або нядзелю i бяжыш кiламетраў 30—35. Да марафону трымаем гэты аб'ём, а ў будня штодзень прабягаю па 18—20 кiламетраў. Наогул, максiмальная спаборнiцкая дыстанцыя ў мяне пакуль 56 кiламетраў.

***— Замахнуцца на больш працяглую дыстанцыю пакуль не хочаце?***

— Пакуль не, не той час. У наступным годзе трэба ўжо рыхтавацца да Алiмпiйскiх гульняў, а значыць, больш сур'ёзна паставiцца да свайго рэжыму, таму што напярэдзе яшчэ адбор на гэтыя спаборнiцтвы. Трэба паказаць час яшчэ лепшы, чым ёсць зараз. Я загарэлася Алiмпiядай, асаблiва пасля гэтага чэмпiянату Еўропы, вельмi хачу туды трапiць. Ужо пасля Токiа-2020 падумаю, цi трэба мне бегчы дыстанцыю яшчэ больш.

***— У якiх экзатычных краiнах давялося спаборнiчаць?***

— Мабыць, толькi ў ПАР. Кiтай, Японiя, ЗША — там нiчога незвычайнага. Наогул, па ходзе забегу па баках глядзець не паспяваеш, глядзiм толькi наперад, а калi яшчэ хтосьцi там перад табой бяжыць, то толькi гэтую мэту i кантралюеш, адстаеш ты цi наадварот дадаеш. Думкi толькi аб бегу, думаеш, дзе трэба дадаць, дзе наадварот зменшыць тэмп.

***— Часта лiдарскiя пазiцыi ў марафоне займаюць спартсменкi з Эфiопii i Кенii. Чым гэта можна растлумачыць?***

— Так, нам заўсёды цяжка з iмi змагацца. Яны жывуць на вышынi, а мы ўнiзе, у iх зусiм iншы клiмат, i гэта дапамагае ў бегу. Вынiк яшчэ шмат у чым залежыць i ад таго, як i ў якiм рэжыме ты трэнiруешся. Можа, у iх там акрамя трэнiровак у жыццi нiчога i няма.

**«Калi нават падаем, праз боль будзем бегчы, але сваю справу зробiм».**

***— Бег у Беларусi ў апошнiя гады становiцца ўсё больш папулярны, вам, як прафесiйнай спартсменцы, прыемна за гэтым назiраць?***

— Вельмi падабаецца бачыць, што гэты рух развiваецца. Мяне часта запрашаюць для правядзення трэнiровак, з задавальненнем адгукаюся, праводжу iх i ў Мiнску, i ў Наваполацку. У родным горадзе спецыяльна для гэтага i адкрыла клуб аматараў бегу, трэнiроўкi праводжу абсалютна бясплатна. У мяне збiраюцца людзi рознага ўзросту, iх усё больш, яны шукаюць для сябе цiкавыя забегi ў Беларусi, заяўляюцца, кожныя выхадныя ездзяць кудысьцi.

***— Як прафесiянал напярэдаднi Мiнскага паўмарафону дайце некалькi парад аматарам бегу, якiя выйдуць на старт у вераснi.***

— Мне б хацелася, каб людзi беглi з задавальненнем, адчувалi сябе добра, таму што калi яны застануцца незадаволеныя, то наступны раз, магчыма, не захочуць бегчы. Хацелася б, каб удзельнiкi атрымлiвалi задавальненне ад атмасферы, якая будзе ў Мiнску шыкоўная, я ўпэўненая ў гэтым. Збярэцца вельмi шмат народу, элiтныя спартсмены. Што датычыцца правiльнага падыходу да забегу, то за дзве гадзiны да старту не варта прымаць ежу. Сняданак павiнен быць у выглядзе кашкi i гарбаты, але нiчога тлустага, вось у гэтым сэнсе варта падысцi да паўмарафону прафесiйна.

# Мiнск — актыўны

**У сталiцы на выхадных адбылося адразу некалькi буйных мiжнародных турнiраў, у штотыднёвым аглядзе "Звязды" расказваем аб iх вынiках.**

1. **Велагоншчык Мiкалай Шумаў перамог у «Гран-пры Мiнска — 2018».** Беларус здолеў апярэдзiць прадстаўнiка Польшчы Марэка Руткевiча i свайго суайчыннiка Яўгена Ахраменку.



Адзначым, шасэйная гонка ў Мiнску сабрала атлетаў з 18 краiн. Для велагрупы «Мiнск» дамашнiя мiжнародныя спаборнiцтвы завяршылiся асаблiва паспяхова. Другое месца ў iншым турнiры, «Кубку Мiнска», якi адбыўся 18 жнiўня, заняў беларус Бранiслаў Самойлаў.

Абодва турнiры з'яўляюцца этапам серыi Europe Tour UCI i ўнесены ў каляндар Мiжнароднага саюза веласiпедыстаў. У маi наступнага года плануецца правесцi яшчэ больш маштабныя гонкi — тэставыя спаборнiцтвы II Еўрапейскiх гульняў.

2. **У Мiнску завяршыўся этап Кубка свету па мастацкай гiмнастыцы.** Прадстаўнiцы Беларусi заваявалi сем узнагарод. Самага высокага вынiку з беларусак дамаглася Кацярына Галкiна, яна заваявала залаты медаль у iндывiдуальных практыкаваннях з абручом i дзве бронзавыя ўзнагароды: у iндывiдуальным мнагабор'i i практыкаваннi са стужкай.

Яшчэ адна беларуска Анастасiя Салас у практыкаваннi з мячом заваявала сярэбраную ўзнагароду, а з булавамi — «бронзу».

У групавых практыкаваннях нашы дзяўчаты двойчы станавiлiся трэцiмi пасля выканання кампазiцый з пяццю абручамi, а таксама трыма мячамi i дзвюма скакалкамi.

Наступны этап Кубка свету пройдзе з 24 да 26 жнiўня ў Казанi. Галоўным жа стартам сезона для беларускiх гiмнастак стане чэмпiянат свету, якi з 10 да 16 верасня прыме Сафiя.

3. **Беларускiя дзюдаiсты перамаглi ў медальным залiку на турнiры European Judo Open у Мiнску.** Спаборнiцтвы прайшлi ў спарткомплексе «Чыжоўка-Арэна» i сталi тэставымi перад II Еўрапейскiмi гульнямi. На рахунку спартсменаў беларускай каманды тры залатыя i дзве бронзавыя ўзнагароды.

У катэгорыi да 90 кг першае месца заняў Вiктар Кляусаў, а ў катэгорыi звыш 100 кг перамогу атрымаў Уладзiслаў Цярпiцкi, Мiкiта Свiрыд (да 100 кг) стаў трэцiм. Сярод жанчын у зборнай Беларусi залаты медаль заваявала Ксенiя Данiловiч (52 кг), бронзавая ўзнагарода дасталася Ульяне Мiнянковай (57 кг).

Адзначым, у турнiры прыняло ўдзел больш за 500 атлетаў.

4. **Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры ўвайшла ў топ-30 сусветнага рэйтынга.** Пасля выхаду ў паўфiнал турнiру ў амерыканскiм Цынцынацi беларуска паднялася на 25-е месца. Аляксандра Сасновiч страцiла адну пазiцыю i займае цяпер 37-е месца, Вера Лапко знаходзiцца на 70-м радку, Вiкторыя Азаранка на 80-й пазiцыi.

5. **Валейбалiсты зборнай Беларусi перамаглi Iспанiю з лiкам 3:2 у квалiфiкацыi да чэмпiянату Еўропы 2019 года.** Пасля двух тураў у турнiрнай табліцы групы Е лiдзiруе наша зборная, у актыве якой дзве перамогi i пяць ачкоў. Наступны матч беларусы правядуць 22 жнiўня з камандай Грузii, пасля хлопцаў чакаюць выязныя гульнi. Завяршыцца адборачны раўнд кантынентальнага форуму ў студзенi.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВIЧ.**

# СПРАЎДЖАНЫЯ МАРЫ РАВАРЫСТА

**ВЫПРАВІЦЦА роварным маршрутам «Валожынскія гасцінцы» самой ды яшчэ і сяброў з сабой паклікаць я асмелілася дзякуючы таму, што неаднаразова пісала пра звязаныя з ім праекты і бывала там. Таму загадзя ведала, што маршрут гэты добра прадуманы, размечаны і прамаркіраваны. Упэўнена, што праехаць па ім будзе пад сілу кожнаму — нават таму, хто ніколі не выязджаў з дому на ровары больш чым на пару гадзін. У сеціве ёсць падрабязная карта і трэкер (з тэлефона ён чамусьці не знайшоўся), якія правядуць і накіруюць на неабходныя сцяжынкі-дарожкі. Усю неабходную інфармацыю пра маршрут, а да таго ж і аўдыягіды можна знайсці па наступнай спасылцы https://eurovelo.by/2016/06/01/vg/. Выпраўляючыся ў падарожжа, паклапаціцеся пра тое, каб яна была ў вашым мабільным тэлефоне — і тады ўсё будзе проста і ясна.**



Арол з распраўленымі крыламі на мураванай ратондзе.



Касцёл Святога Міхала ў Багданаве.

Такім чынам, мы спакавалі заплечнікі, у якія акрамя некалькіх асабістых рэчаў паклалі яшчэ і дажджавікі, лёгкія камплекты сухой вопраткі (дзякуй богу, яны нам так і не прыдаліся). Узялі ежу для сняданку і пару лёгкіх перакусаў. І ўзброіліся натхненнем перажыць не самыя звычайныя выхадныя ў сваім жыцці.

Прафесійных раварыстаў у нашай кампаніі не было. Аднак хлопцы, якія ехалі з намі, паклапаціліся пра тое, каб узяць з сабой невялічкія наборы інструментаў — і яны спатрэбіліся нават двойчы. Увогуле ж знаўцы раяць браць з сабой яшчэ і запасную камеру — на той выпадак, калі ў кагосьці праб'ецца кола, каб можна было яе аператыўна замяніць.

Не хачу пакінуць вас без апісання прыгод і адзначу, што яны пачаліся з таго моманту, калі мы не паспелі выехаць на вакзал за гадзіну да патрэбнага часу, а ўсяго толькі за паўгадзіны. Частка нашай кампаніі імчалася ў напрамку вакзала па сталічным праспекце Незалежнасці а 6-й гадзіне раніцы з велізарнай хуткасцю. Бо спяшалася на электрычку, якая адпраўлялася на Маладзечна ў 6.26. Паспець на яе нам удалося хіба што цудам... Дадам толькі, што пры перавозцы ровара трэба набываць два квіткі — і на сябе, і на яго — тады вам, у адрозненне ад некаторых з нас, не давядзецца плаціць штраф.

Не без пэўных складанасцяў мы ўкамплектаваліся ў вагонах разам са сваімі «жалезнымі конямі». Дабраліся да Маладзечна, там зрабілі перасадку, на якую мелі не больш за паўгадзіны. Пераселі на дызель, што ідзе да Ліды. Ён высадзіў нас на станцыі Багданава — гэта і ёсць пачатак маршруту «Валожынскія гасцінцы».

## У ГОСЦІ ДА ФЕРДЫНАНДА

Варта адзначыць, што па дарозе нам неаднаразова сустракаўся самы сапраўдны анёл — праўда, у вобразе чалавека. Назавём яго Сяргеем. Спачатку ён дапамог уладкаваць некалькі ровараў у даволі цесным вагоне. Затым ужо ў Багданаве на вакзале сарыентаваў, у які бок паехаць. І пасля таго сустракаўся нам яшчэ не раз і дапамагаў.

Колішняя сядзіба мастака Фердынанда Рушчыца знаходзіцца крыху ўбаку ад асноўнага маршруту, у вёсцы Багданава. Спачатку мы меркавалі туды не заязджаць. Аднак, мабыць, сам Фердынанд, рукой бабулі, якая паказала, куды павярнуць, прыманіў нас у сваю прысутнасць.

І мы нiколькі не пашкадавалі! Багдавана — надзіва жывая, прыгожая, я б сказала нават адухоўленая вёска, яна паходзіць хутчэй на мястэчка.

У 1844 годзе тут быў пабудаваны касцёл Святога Міхала, выяўлены на самай вядомай карціне Рушчыца «Каля касцёла». Праўда будынак гэты двойчы гарэў. У сваім цяперашнім выглядзе касцёл быў адбудаваны ў 1999 годзе. Але гэта той мур, які варта ўбачыць і ў яго сучасным выглядзе. Глядзіш — і адчуваеш велічнасць, загадкавую атмасфернасць месца, пэўную ўзнёсласць. Падавалася, тут проста немагчыма не стаць мастаком.

Да колішняй сядзібы ехалі па доўгай старой ліпавай алеі. Тым часам вось што можна было прачытаць у даведачнай інфармацыі веламаршруту:

*«Вялікі сядзібны дом быў двухпавярховым, каменным, але крыху няўтульным, хоць і змяшчаў велізарную бібліятэку, калекцыю карцін і скульптур. Рушчыцы практычна не жылі ў гэтай «мураванцы», там размяшчаліся госці. Сям'я пасялілася ў драўляным зрубе з лістоўніцы, каля якога раслі кусты бэзу і руж. Вакол дома размяшчаўся парк, асабліва зачараванне якому надавала сажалка з востравам для баброў».*

Гэта нагода для вясёлых разважанняў — не жыць у вялікім мураваным доме са скульптурамі і бібліятэкай, таму што там няўтульна... Нам бы гэтую няўтульнасць! З іншага боку, калі пад вокнамі драўлянага дома раслі кусты бэзу і руж, я магу Рушчыцаў зразумець.

На ўзгорку, дзе, па нашых падліках, мог стаяць драўляны дом, расло даволі шмат чабару. Я не ўтрымалася ад спакусы нарваць яго паболей, каб высушыць дома і заварваць халоднымі асеннімі вечарамі гарбату. Такім чынам у маім заплечніку з'явіўся дадатковы вельмі пахучы груз.



Могілкі часоў Першай сусветнай вайны ў Дзесятніках.

З-за ліхалеццяў XX стагоддзя сядзіба Рушчыцаў не ацалела — яна згарэла ў 1944 годзе падчас вызвалення Валожыншчыны ад фашыстаў. Да нашых дзён дайшлі толькі падмуркі, сутарэнні, старыя дрэвы, ручай — да яго мы таксама не прамінулі падысці.

Пазней даведалася, што літаральна за некалькі дзён да нашай вандроўкі на месца колішняй сядзібы прыязджаў нашчадак Фердынанда Рушчыца, а разам з ім прадстаўнікі некаторых устаноў культуры. Аказваецца, сядзібу плануюць аднаўляць! Таму нашы фотаздымкі, руіны на іх, якія ўдалося пабачыць на свае вочы, хутка таксама стануць гісторыяй.

## АРОЛ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ

Мы вярнуліся крыху назад, на асноўны маршрут, і, праехаўшы вёску Дзесятнікі, зайшлі на мясцовыя могілкі часоў Першай сусветнай вайны. І гэта яшчэ адно месца насамрэч вартае ўвагі. Ніколі б не падумала, што могілкі могуць быць настолькі прыгожымі. Калі будзеце праязджаць міма, не забудзьцеся зазірнуць сюды. Вось што паведамляецца ў даведачнай інфармацыі:

*«За вёскай Дзесятнікі захавалася адно з самых буйных пахаванняў часоў Першай сусветнай вайны. Вельмі часта гэтыя могілкі называюць месцам пахавання салдат нямецка-аўстрыйскай арміі, аднак тут пахаваны таксама і рускія салдаты. Пасля баёў у полі працавалі спецыяльныя санітарныя брыгады, якія збіралі целы*



*забітых воінаў і хавалі іх побач, перадаючы дакументы і салдацкія жэтоны варожаму боку».*

Надзвычай цікавай з'яўляецца мураваная ратонда, увянчаная вялікім арлом з распраўленымі крыламі, усталяваная каля ўваходу на могілкі. Зроблена яна была архітэктарам Болманам з Брэмена ў 1916 годзе. Самі могілкі акрамя іншага цікавыя тым, што ўяўляюць сабой вялікую адкрытую прастору, абнесеную мураваным валам, які за даўнасцю часу ўжо парос мохам. Адметна і тое, што тэрыторыя могілак даволі ўзгорыстая, а вал паўтарае форму ўзгоркаў. Большасць магіл датаваныя 1916 годам: менавіта ў гэты час тут спыніўся фронт.

Крыж і мемарыяльная шыльда з надпісам «Тут спачываюць салдаты — ахвяры Першай сусветнай вайны» ўстаноўлена на працягу апошніх дзесяці гадоў. Нямецкія дабрачынныя фонды да нашага часу выдзяляюць сродкі на падтрымку гэтых пахаванняў.

Гэта быццам тыя самыя класічныя вайсковыя могілкі, якія мы маглі бачыць у амерыканскіх фільмах. Аднак каменныя пліты ўжо амаль цалкам ураслі ў зямлю. Надпісы на іх расчытаць даволі складана, але пры вялікім жаданні яшчэ магчыма.

Дарэчы, адразу за Дзесятнікамі ідуць звычайныя вясковыя могілкі, на іх шмат пахаванняў польскага часу. Яны па-свойму цікавыя. Аднак не параблытайце — могілкі часоў Першай сусветнай пабачыце адразу за імі. Вы пазнаеце іх па вялікай ратондзе і па прыгожай адкрытай прасторы; а ўнізе, за абрывам, плёскаецца рака...

## ДОМ ПАЛЯЎНІЧАГА

Перад наступным пунктам маршруту, Вішневам, знаходзіцца яшчэ адна адметная мясціна. Аднак каб дабрацца да яе, давядзецца крыху збочыць. Адразу пасля пераезду цераз раку Альшанку трэба павярнуць налева — у заходнім напрамку знаходзіцца парк і сядзіба Храптовічаў «Адравонж». Важна, што сядзіба захавалася да нашага часу:

*«Парк атачае сядзібу, якая паўстала на месцы старога фальварка ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Сваю назву маёнтак набыў па імені радавога герба ўладальнікаў. Сядзіба выкарыстоўвалася ў якасці паляўнічай рэзідэнцыі, займаючы плошчу ў 50 гектараў, а сам сядзібны дом называлі «паляўнічым палацам» — гэта двухпавярховы мураваны будынак з дахам для назірання. Ён нядрэнна захаваўся да нашых дзён.*

*Сядзібу акружаў выкапаны ўручную канал, што надавала ёй некаторую адасобленасць. Да галоўнага сядзібнага дома вялі тры дарогі, а ўезды былі перакрытыя варотамі, побач з якімі былі пабудаваныя паляўнічыя старожкі. Да нашых дзён ацалеў толькі адзін уезд».*

У савецкія часы сядзіба Храптовічаў выкарыстоўвалася ў якасці дзіцячага піянерскага летніка, які ў 1990-я быў зачынены. З таго часу сядзіба пустуе. Аднак з 2008 года тэрыторыя былога маёнтка Храптовічаў аб'яўлена помнікам прыроды мясцовага значэння.

Дзеля справядлівасці аповеду адзначу, што ў «Адравонж» мы не заязджалі. Бо вырашылі сэканоміць час, каб з'ездзіць паглядзець драўляныя масткі на балоце. Што з гэтага атрымалася, чытайце ў наступным выпуску «Ігуменскага тракта». Да таго ж я распавяду, якія цікавінкі мы пабачылі ў самім Вішневе і як па-асабліваму нас сустрэлі ў доміку для раварыстаў на Сакаўшчынскім вадасховішчы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*Валожынскі раён*

Пантэон Айчыны

# Пётр Мсціславец

*(? — пасля 1579)*

**Кнігі, якія ён надрукаваў, данеслі праз стагоддзі ягонае імя — Пётр Цімафеевіч Мсціславец. Пра гэтага чалавека можна сказаць, што ён рассяваў духоўнае насенне і яно парасткамі ўзыходзіла ў людскіх душах. Вялікая місія вялікага асветніка. Імя Пятра Мсціслаўца непарыўнае з імем іншага вялікага асветніка Івана Фёдарава. Сумесна яны сталі заснавальнікамі рускага кнігадрукавання.**




Невядомы год нараджэння Пятра Мсціслаўца, а само прозвішча можа ўказваць на тое, што паходзіў ён з горада Мсціслава. Застаецца загадкай, дзе і як навучыўся Мсціславец друкарскай справе і чаму ён апынуўся ў Маскве. Можа ён, як і ягоны напарнік Іван Фёдараў (беларускі шляхціц Іван Фёдаравіч герба «Рагоза»), вучыўся ў Кракаўскім універсітэце. З пазнейшых крыніц вядома, што абодва друкары навучыліся кнігадрукаванню «от самех фряг (італьянцаў. — **В. Ч.**)».

Відавочна, што да прыезду ў Маскву Мсціславец быў выдатным майстрам кнігадрукавання «искуша бяху и смыслени к таковому хитрому делу». Пэўна, таму і запрасілі яго ў Маскву для работы ў створанай царом Іванам Грозным друкарні. Магчыма і тое, што Мсціславец і Фёдараў самі білі чалом цару аб заснаванні друкарні. І вось 19 красавіка 1563 года Мсціславец і Фёдараў прыступілі да друкавання «Апостала». А дагэтуль яны зрабілі значную тэксталагічную і рэдактарскую працу. Паколькі, як прызнаваліся друкары, старыя царкоўнаславянскія кнігі Святога пісьма былі «сапсаваныя» перапісчыкамі, дык перад друкарамі паўстала складаная задача — выправіць памылкі, а гэта было па сілах толькі высокаадукаваным тэолагам, лінгвістам, філолагам. Меў рацыю знаўца Бібліі Сымон Будны, калі адзначыў, што «мала для гэтага галоў» Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца, але прызнаў, што іншыя павінны быць ім удзячныя за іх працу.

Неўзабаве друкары выдалі яшчэ адну кнігу — «Часоўнік». І на гэтым давялося спыніць работу ў Маскве. Як успамінаў Іван Фёдараў, друкарню зачынілі з-за «озлобления, часто случающегося нам от многих начальник и священноначальник и учитель, которые на нас зависти ради многие ериси умжиляли».

Друкары адправіліся ў Літву (дакладней вярнуліся на радзіму). Іх падтрымаў вялікі гетман літоўскі Рыгор Хадкевіч, які запрасіў майстроў у свой падляшскі маёнтак Заблудаў. Хадкевіч вызначыўся не толькі пераможнымі бітвамі з ворагам, але і асветніцкай дзейнасцю. Ён марыў выдаваць кнігі для «народу христианскому русскому литовскому, да и русскому московскому, да и повсюду всем православным христианам, иже в Болгарех, и в Сербе, в Мильтенех и Волосех». Мсціславец і Фёдараў якраз і падыходзілі да гэтых грандыёзных планаў «научение людям».

І вось 17 сакавіка 1569 года Пётр Мсціславец і Іван Фёдараў выдалі ў Заблудаве «Евангелле вучыцельнае», як яны пісалі, «к лучшему поучению і направлению душевному». У гэтую кнігу яны ўключылі твор славутага царкоўнага пісьменніка Кірылы Тураўскага «Слова на Ушэсце», нібыта засведчылі працяг ягонай асветніцкай традыцыі. А іншая кніга «Псалтыр з Часаслоўцам» была апошнім Заблудаўскім выданнем Мсціслаўца і Фёдарава. Хвароба Хадкевіча спыніла работу Заблудаўскай друкарні. Мсціславец падаўся ў Вільню, а Фёдараў на Украіну, дзе яны працягнулі сваю друкарскую дзейнасць.

У Вільні Мсціславец пачынаў з нуля. У горадзе не было ніводнага друкара, таму стварыць новую друкарню было для яго «выше нашея меры». Аднак Мсціслаўца падтрымалі багатыя віленскія купцы Мамонічы, віленскі бурмістр Зянон Зарэцкі і яго брат Іван. Друкар лічыў сваю справу Божым талентам, дадзеным яму дзеля карысці людзей: «аще и един талант вверен будет, то не ленитися подабает, но прилежно делати». Вось і працягваў ён «делати» кнігі. У 1575 годзе Мсціславец выдае «Евангелле напрастольнае», а следам яшчэ дзве кнігі — «Псалтыр» і «Часоўнік».

Тое, што часта адбывалася з падзвіжнікамі, адбылося і з Пятром Мсціслаўцам. Ягоныя высакародныя памкненні не стасаваліся з суровай рэчаіснасцю. У свой час з-за гэтага спыніў друкарскую дзейнасць Францыск Скарына, і вось ягоны паслядоўнік сутыкнуўся з падобным становішчам. Матэрыяльныя цяжкасці, жыццёвая нястача, канфлікты могуць нанесці смяротны ўдар па самых чыстых і высакародных памкненнях.

У Мсціслаўца пачаліся судовыя разбіральніцтвы з адным са сваіх кампаньёнаў Кузьмой Мамонічам. Пэўна, Пятра не задавальняла роля друкара, і ён дамагаўся таго, каб на роўных з Мамонічамі кіраваць друкарняй і ўдзельнічаць у выдавецкіх праграмах. Гэты канфлікт перашкодзіў Пятру Мсціслаўцу выдаваць кнігі. У 1576 годзе віленскі суд пастанавіў вярнуць яму друкарскае начынне і прылады і выплаціць кампенсацыю. А майстар павінен быў аддаць Мамонічу «книги выдрукованыя». На бяду друкара, Мамоніч не выканаў пастановы суда, а значыць ён не мог займацца кнігадрукаваннем. Давялося зноў судзіцца, і ў рэшце рэшт Мсціславец прайграў працэс. Друкарня перайшла ў чужую ўласнасць. Для Мсціслаўца гэта стала сапраўднай трагедыяй. Матэрыяльных сродкаў на тое, каб зноў наладзіць кнігадрукаванне, у яго не было. Пасля 1579 года сляды Пятра Мсціслаўца губляюцца, але ягонае імя засталося на кнігах, надрукаваных ім, якія неслі людзям «духоўнае насенне».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі

# ПІСЬМЕННІК, А ДЗЕ ЖЫВЕШ ТЫ?



**Адказ на гэтае пытанне просты. Тыя творцы, якіх ужо няма з намі, жывуць не толькі ў сваіх творах. Яшчэ і ў дамах-музеях, пільна сабраных з аскепкаў былога і такім чынам захаваных не толькі дзеля іх саміх, але і для нашчадкаў. Памяць павінна быць пэўным чынам матэрыялізавана і ўвасоблена. А дакладней, сабрана з рэчаў, якія належалі літаратару ці яго эпосе.**

Калі трапляеш у музеі ці дамы-музеі пэўных творцаў, перад табой адразу адкрываецца зусім іншы, асаблівы свет. Здаецца, што кожная сцяна, кожная рэч напоўненыя даўняй атмасферай. Кнігі, сшыткі, чарніліцы і пажоўклыя нататнікі быццам маюць асаблівы, вельмі сімвалічны сэнс. З гэтага кубку сапраўды піў ствральнік вялікай паэмы? А на гэтым ложку ён спаў ці пакутаваў ад бяссонніцы, калі абдумваў новы твор? Усё робіцца важным, напоўненым сімвалізмам. Вось пісьмовы стол пісьменніка, вось абажур, каля якога ён любіў заседжвацца вечарамі.

Такія месцы выклікаюць не толькі ўзнёслае трапятанне. З іншага боку, яны паказваюць, што пісьменнік — таксама рэальны чалавек, які меў патрэбу ў даху над галавой і ў рабочым месцы. Можа, на пачатку свайго творчага шляху ён жыў у камунальнай кватэры, можа, займаў усяго кут у вясковай хаце. І ўжо пазней, з прыходам вядомасці, прызнання, маглі змяніцца і яго побытавыя выгоды. Кагосьці гэта нават натхніць, прымусіць задумацца: ствараць штосьці сваё, рэалізоўваць уласнае бачанне трэба не дзякуючы чамусьці, а насуперак. Нягледзячы на сціплыя ўмовы, недастатковы камфорт, чыёсьці неразуменне. Каб аднойчы такія камунальныя кватэры, такія маленькія хаткі змаглі зрабіцца гісторыяй. Бо тыя, хто ў іх жыў у свой час, бачылі шырэй, глыбей і вышэй за тое, што вакол. Ці, можа, уся справа сапраўды была ў такім рамантычным абажуры, кветачках на шпалерах і невялікім зграбным дубку пад акном (які з часам ператварыўся ў сапраўднага дуба-дзядулю), што дадаваў загадкавасці наваколлю?..

Прыгадваецца пазалеташняе свята беларускага пісьменства, якое праходзіла ў Рагачове. Я ездзіла па ваколіцах, шукаючы згадкі пра пісьменнікаў, якія жылі і тварылі ў тых мясцінах. Асобная экспазіцыя, прысвечаная літаратарам, ёсць у Рагачоўскім музеі народнай славы. З той мясцовасцю зніталаваны лёс Міхася Лынькова; аднак з сумам давялося даведацца, што на пачатку 2000-х гадоў домік чыгуначнага наглядчыка, у якім працаваў бацька будучага творцы і ў дзяцінстве жыў ён сам, быў знесены. Думаецца, што такое месца, непасрэдна звязанае з тэматыкай творчасці Лынькова, які часта пісаў пра чыгунку, пра дзіцячыя вандроўкі з бацькам-машыністам, магло б стаць сапраўды ўнікальным — і, магчыма, не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце, бо аналагічных яму не прыгадваецца. Ды хтосьці падумаў, што знесці прасцей, чым аднавіць. Так, разбурыць сапраўды прасцей. Можа, домік той насамрэч быў у дрэнным стане. Але з рашэннем аб тым, што аднаўляць не варта, была знішчана і значная частка ўнікальнай памяці...



Бываючы за мяжой, я часта ўражваюся той вялікай колькасцю дамоў-музеяў пісьменнікаў, якія ёсць там. А дакладней, дзіўлюся, што яны амаль адсутнічаюць у нашай краіне. Доўгі час не магла зразумець, чаму ж так адбываецца? Часткова адказ на гэтае пытанне знайшоўся ў відэаінтэрв'ю вядомага краязнаўца Алеся Белакоза, які пайшоў з жыцця два гады таму. Ён расказаў, што літаратурныя музеі ў савецкі час у нас не віталіся. Можна было зрабіць краязнаўчы музей, ваенны — але не літаратурны! Што ўжо казаць пра дом-музей пісьменніка.

Месцы, звязаныя са слыннымі літаратарамі, пры належным падыходзе, могуць быць вельмі і вельмі цікавыя людзям! Па-першае, таму што творы найвядомейшых класікаў амаль усе чыталі хоць бы ў школе. Значыць, тое, што звязана з аўтарам ці яго героямі, не можа не выклікаць цікавасці, не нарадзіць пэўных асацыяцый. «Так, я памятаю Ганну Чарнушку. А вось, аказваецца, з якой дзяўчыны аўтар пісаў яе», — такія думкі могуць пранесціся ў нейчай галаве, калі чалавек паглядзіць на невялічкі пажоўклы здымак чарнявай прыгажуні ў музейнай экспазіцыі. «Прыгожыя сумачкі былі ў Яўгеніі Янішчыц, — падумае нейкая сучасная красуня, знаходзячыся ў музеі паэткі, — я б таксама насіла такія!» А па-другое, таму што любая літаратура сама па сабе з'яўляецца нацыянальнай. Гэта мова, побыт, цэлая эпоха, адлюстраваная ў творы і захаваная ў музеі аўтара.

У першую нядзелю верасня горад Іванава прыме важны для нашай краіны Дзень беларускага пісьменства. Вельмі шмат зроблена для добраўпарадкавання горада, цяпер работы блізяцца да фінальнага акорда. Вядома ж, многія з нас паедуць туды, каб святкаваць разам, каб разважаць і прамаўляць штосьці гучнае пра айчыннае пісьменства. Але ж мне асабіста вельмі марыцца, каб ужо пачынаючы з наступнага, 2019-га, года да кожнага свята пісьменства мы адкрывалі б хоць бы па адным доме-музеі пісьменніка, які жыў у тых мясцінах, якія на гэты раз абраныя сталіцай свята пісьменства.

І такой матэрыялізаванай і адухоўленай памяці не было б цаны.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

ОАО «Лорри-Сервис» информирует о сокращении количества акций (08.08.2018 г.).

Размер УФ – 218474,80 бел. руб. Количество простых (обыкновенных) акций – 92413 шт., количество привилегированных акций – 555 шт.

УНП 200246280

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует об отмене** электронных торгов по продаже административного помещения (инв. № 500/D-708041786), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 64А-94, принадлежащего ЗАО «Вирас», назначенного на 27.08.2018 (публикация извещения в газете «Звязда» от 09.08.2018) **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42, www.cpo.by**

УНП 100660503

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО УАКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА**

ОРГАНИЗАТОР: НОВОЗАРЯНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма залога, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Симновичи, ул. Озерная, 10У площадью-0,1800 га, кадастровый номер 225183310101000048 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона рек и водоемов (озеро Лукомльское) | 1506,79 | 4000 | 400 |

1. Аукцион состоится 21 сентября 2018 года в 15.00 по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, аг. Новая Заря, ул. Мира, 1А, каб. 2.

2. Заявление от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, аг. Новая Заря, ул. Мира, 1А, каб. 3. Последний день приема заявлений – 18 сентября 2018 года до 17.00.

3. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования); представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату залога на расчетный счет BY93BAPB36413290600220000000 ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление РКЦ № 10, БИК BAPBBY22424, УНП 300986744, код платежа – 04002, получатель – Новозарянский сельский исполнительный комитет.

4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: (8 02133) 2 64 45, 2 64 35.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Крупское районное потребительское общество (продавец) проводит открытый аукцион по продаже следующего объекта недвижимого имущества:

**Здание магазина «Продукты № 2»**, общей площадью **133,5 кв. м**, инв. № 613/С-13963, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623050100001002622 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0254 га**, по адресу: **Минская область, г. Крупки, ул. Советская, 51.**

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона реки, водоема площадью 0,0254 га, охранная зона линий связи и радиофикации площадью 0,0047 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **80 000** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 8000 бел. руб.).

**Задаток перечисляется на р/с №BY48BAPB30153214700100000000,** БИК BAPBBY2X в ЦБУ № 525 г. Крупки региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк», ул. Советская, 10, УНН 600093961, ОКПО 01796656.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Аукцион состоится 20.09.2018 г. в 12.00 по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Ленина, 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.09.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (801796) 54-936, 555-67.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «O.b. ДЕЙСТВУЙ»

Настоящие правила проведения рекламной игры «O.b. действуй» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под торговой маркой «O.b.», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «O.b. действуй» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Игровой продукт** – товар торговой марки «O.b.».

**Персональные данные** – совокупность данных, которые необходимо указать при регистрации на интернет-сайте для участия в розыгрышах призов (фамилия, имя, отчество Участника, пол, дата рождения, почтовый адрес: почтовый индекс (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно), дом (обязательно), корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии, обязательно), адрес электронной почты (обязательно); номер телефона).

**Карта лояльности** – карта торговой сети «Мила», которую необходимо предъявить при покупке Игрового продукта.

**Текущий розыгрыш** – каждый розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

**Порядковый номер Участника** – это номер, который присваивается Участнику после успешной регистрации Кассового чека на странице Рекламной игры на интернет-сайте по дате и времени регистрации Чека и отправки установленными Правилами Персональных данных.

**Интернет-сайт** – сайт https://mila.by/personal/reklamnaya-igra/, на котором Участникам Рекламной игры необходимо ввести Персональные данные.

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры** – Общество с ограниченной ответственностью «Стандарт Чистоты», Беларусь, Менковский тракт, 14, комната 110, Щомыслицкий с/с, район деревни Озерцо, 223021, Минская область, Минский район, Республика Беларусь, УНП 191354958.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, а также супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники и лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства.

**4. Наименование Рекламной игры:** «O.b. действуй».

**5. Территория проведения Рекламной игры:** магазины торговой сети «Мила», находящиеся на территории Республики Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 16 августа 2018 г.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 5 октября 2018 г.

**8. Наименования Игровых продуктов, участвующих в Рекламной игре, в целях стимулирования их реализации.**

Товары, выпускаемые под товарным знаком «O.b.», в ассортименте:

O.b. Procomfort Normal;
O.b. Procomfort Super;
O.b. Procomfort Super Plus;
O.b. Procomfort Mini;
O.b. Procomfort Night Normal;
O.b. Procomfort Night Super;
O.b. Procomfort Night Super + Comfort;
O.b. Original Normal;
O.b. Original Super;
O.b. Original Super Plus;
O.b. Compact Applicator Normal;
O.b. Compact Applicator Super,

реализуемые в магазинах торговой сети «Мила», находящихся на территории Республики Беларусь.

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

| Наименование | Кол-во, шт. | Стоимость за единицу (бел. руб.) | Общая сумма (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| **Приз 1:** | | | |
| Запас O.b. (11 упаковок тампонов О.В. женских гигиенических Pro Comfort Normal по 16 шт. в упаковке + футляр для тампона + коробка) | 120 | 44,32 | 5 318,40 |
| **Приз 2:** | | | |
| Сертификат на поездку в Тайланд на 2 человек на 10 дней (включающий перелет Москва (Киев) – Королевство Таиланд – Москва (Киев), отель 3*, с питанием завтрак-ужин, медицинская страховка, виза, трансфер Минск – аэропорт вылета – Минск, трансфер аэропорт прилета – отель – аэропорт вылета; период предоставления тура: 20.10.18 – 15.12.18) В связи с необходимостью открытия визы для посещения Королевства Таиланд победитель Рекламной игры должен обратиться в агентство с сертификатом на тур не позднее, чем за месяц до предполагаемого путешествия | 4 | 4 950,00 | 19 800,00 |
| Денежные средства в размере 721,43 белорусского рубля | | 721,43 | 2 885,72 |

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица в размере **28 004,12 (Двадцать восемь тысяч четыре белорусских рубля 12 копеек)**.

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо в срок с 16.08.2018 по 15.09.2018:

10.1.1. купить Игровой продукт, реализуемый в магазинах торговой сети «Мила», находящихся на территории Республики Беларусь, предъявив при покупке карту лояльности торговой сети «Мила»;

10.1.2. достоверно заполнить Персональные данные на интернет-сайте https://mila.by/personal/reklamnaya-igra/ (либо проверить корректность ранее заполненных данных), а именно:

– персональные данные: фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно), пол, дата рождения, почтовый адрес: почтовый индекс (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно), дом (обязательно), корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии, обязательно);

– адрес электронной почты (обязательно);

– номер мобильного телефона Участника в международном формате.

10.1.3. подтвердить согласие на участие в рекламных мероприятиях на интернет-сайте https://mila.by/personal/reklamnaya-igra/ в периоды, указанные в Таблице 1.

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется.

10.2. При повторной покупке Игрового продукта (выполнение условий п. 10.1.1. настоящих Правил) повторное выполнение условий п. 10.1.2. и 10.1.3. настоящих Правил не требуется.

10.3. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки Игрового продукта и выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

10.4. Покупка Игрового продукта, заполнение Персональных данных (либо проверка корректности ранее заполненных данных) и подтверждение согласия на участие в рекламных мероприятиях на интернет-сайте должны быть совершены в один игровой период согласно Таблице 1.

10.5. Участники при заполнении Персональных данных обязаны вводить достоверную информацию.

10.6. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры и за достоверность сведений, указанных при заполнении анкеты.

**11. Место, даты, время и порядок проведения Розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры:**

Розыгрыши призов проходят по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 20/11, офис 507.

**Розыгрыши Призов.**

Все Участники Игры, выполнившие условия, указанные в п. 10, участвуют в розыгрыше Призов.

Даты и время проведения розыгрышей призов указаны в Таблице 1.

Таблица 1.

| № розыгрыша, дата и время | Участвуют участники, выполнившие условия, указанные в п. 10.1. настоящих Правил в период с … по … | Призы |
|---|---|---|
| **№ 1, 28.08.2018, 12.00** | **с 16.08.2018 (00:00:00) по 24.08.2018 (23:59:59)** | Приз 1 – 30 шт. Приз 2 – 1 шт. |
| **№ 2, 04.09.2018, 12.00** | **с 25.08.2018 (00:00:00) по 31.08.2018 (23:59:59)** | Приз 1 – 30 шт. Приз 2 – 1 шт. |
| **№ 3, 11.09.2018, 12.00** | **с 01.09.2018 (00:00:00) по 07.09.2018 (23:59:59)** | Приз 1 – 30 шт. Приз 2 – 1 шт. |
| **№ 4, 18.09.2018, 12.00** | **с 08.09.2018 (00:00:00) по 15.09.2018 (23:59:59)** | Приз 1 – 30 шт. Приз 2 – 1 шт. |

**Порядок проведения розыгрышей призов.**

11.1. До начала каждого розыгрыша Комиссия формирует список Участников, которые выполнили условия Игры. При этом в списке Участникам присваиваются порядковые номера (000001, 000002, 000003 и т. д.) по дате и времени покупки.

